МІЖНАРОДНЫ
КАМІТЭТ
ПА РАССЛЕДАВАННІ
КАТАВАННЯЎ
У БЕЛАРУСІ

# “Вы здохнеце тут”

## Вязні Акрэсціна сведчаць

*Грамадскае расследаванне выпадкаў масавых катаванняў
у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў горада Мінска
9–14 жніўня 2020 года*



(c) Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, 2023

# Змест

**Уводзіны** 4

**Рэзюмэ** 5

**9 жніўня 2020 года** 7

Заканчэнне галасавання на выбарах прэзідэнта. Затрыманні ў Мінску 7

19:00 — 24:00 7

Двор ЦІП, "калідор" з сілавікоў 7

Прагулачныя дворыкі ЦІП 9

Камеры, калідоры ЦІП 9

**10 жніўня 2020 года** 11

00:00 — 07:00 11

Двор ЦІП 11

Прагулачныя дворыкі ЦІП 12

Камеры, калідоры ЦІП 13

07:00 — 24:00 15

Двор ЦІП 15

Прагулачныя дворыкі ЦІП 16

Камеры, калідоры ЦІП 17

**11 жніўня 2020 года** 20

00:00 — 07:00 20

Двор ЦІП 20

Прагулачныя дворыкі ЦІП 21

Камеры, калідоры ЦІП 21

07:00 — 24:00 23

Двор ЦІП 23

Прагулачныя дворыкі ЦІП 23

Камеры, калідоры ЦІП 24

**12 жніўня 2020 года** 26

00:00 — 07:00 26

Двор ЦІП 26

Прагулачныя дворыкі ЦІП 27

Калідор ЦІП, камеры 27

07:00 — 24:00 28

Двор ЦІП 28

Прагулачныя дворыкі ЦІП 28

Камеры, калідоры ЦІП 29

**13 жніўня 2020 года** 32

00:00 — 07:00 32

Двор ЦІП 32

Прагулачныя дворыкі ЦІП 33

Камеры, калідоры ЦІП 34

07:00 — 24:00 35

Двор ЦІП 35

Прагулачныя дворыкі ЦІП 35

Камеры, калідоры ЦІП 36

**14 жніўня 2020** 37

00:00 — 07:00 37

07:00 — 24:00 37

**Збіццё, траўмы, пашкоджанні ў пацярпелых ад гвалту людзей** 39

Фота з кейсаў пацярпелых, якія былі апытаныя Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі 42

Фота са справаздачы "Беларусь: скаардынаваная палітыка катаванняў. Судова-медыцынская экспертыза 50 выпадкаў катаванняў" 44

**Асобы, адказныя за катаванні затрыманых у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў** 47

**Прававая кваліфікацыя дзеянняў супрацоўнікаў сілавых органаў Беларусі** 54

# Уводзіны

Пасля фальсіфікацыі выбараў прэзідэнта 9 жніўня 2020 года па Беларусі пачаліся масавыя мірныя пратэсты. Дзеяннямі рэжыму ў адказ стала прымяненне сілавікамі зброі, светла-шумавых гранатаў, слезацечнага газу. Сілавікі масава затрымлівалі і збівалі пратэстоўцаў. Неапраўданая жорсткасць у дачыненні да мірных дэманстрантаў працягвалася і пасля затрыманняў.

Сярод затрыманых былі не толькі непасрэдныя ўдзельнікі пратэстаў. Сілавікі хапалі і непаўнагадовых, людзей пенсійнага ўзросту, людзей з інваліднасцю, а таксама выпадковых мінакоў.

Затрыманых у горадзе дастаўлялі ў розныя ўстановы ўнутраных справаў. У Мінску асноўным месцам утрымання затрыманых стаў Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў ГУУС Мінгарвыканкама, размешчаны па адрасе 1-шы завулак Акрэсціна, 36[1] (далей — ЦІП).

За пяць дзён (9–14 жніўня 2020 года) праз ЦІП, разлічаны на ўтрыманне 110 чалавек, сілавікі “прагналі” больш за тры тысячы затрыманых.

Усе затрыманыя траплялі пад прыніжальныя працэдуры пры размяшчэнні ў ЦІП, жорсткае збіццё, утрымліваліся ў нечалавечых умовах у перапоўненых камерах без ежы і вады па двое і болей сутак. Людзей збівалі пры любой спробе высветліць свой статус, патрабаваць выканання сваіх правоў і медыцынскай дапамогі. У збіцці ўдзельнічалі як супрацоўнікі ЦІП, так і сілавікі з АМАПа (гл. відэа са сведчаннямі затрыманых[2]).

13 жніўня 2020 года беларускія праваабаронцы звярнуліся да міністра МУС Юрыя Караева з патрабаваннем спыніць здзекі ў ЦІП і іншых месцах утрымання затрыманых і расследаваць выпадкі катаванняў[3].

Намеснік кіраўніка МУС Беларусі Аляксандр Барсукоў спачатку заявіў, што “здзекаў ніякіх не было”[4]. На наступную раніцу ён удакладніў, што “ў камеры нікога не збівалі”[5].

Адначасова з такімі заявамі, затрыманых працягвалі збіваць, пра што маюцца шматлікія сведчанні, у тым ліку, у выглядзе аўдыязапісаў.

У ноч з **12 на 13 жніўня** родныя тых, хто ўтрымліваўся ў ЦІП на Акрэсціна запісалі гукі бесперапыннага збіцця, што было добра чуваць на вуліцы. На запісах чуваць галасы людзей, якія гучна крычаць ад болю і просяць пра літасць[6].

**14 жніўня** пачалі масава выпускаць затрыманых. Некаторых вывозілі на машынах хуткай дапамогі. Тыя, хто выйшлі на свабоду, паказалі свае раны і траўмы ад катаванняў.

1. https://minsk.mvd.gov.by/ru/page/centr-izolyacii-pravonarushitelej

Агульная назва “Акрэсціна” на працягу шматлікіх гадоў асацыюецца ў Беларусі з незаконнымі затрыманнямі грамадзянаў па палітычных матывах. Гэтае месца стала сімвалам катаванняў мірных грамадзянаў, нязгодных з фальсіфікацыямі на выбарах, удзельнікаў пратэстаў у 2020— 2022 гадах.

2. https://www.youtube.com/watch?v=tikikCIuPrk
3. https://www.legin.by/posts/255
4. https://www.youtube.com/watch?v=Du6ZvyHmTGE
5. https://t.me/radiosvaboda/5873
6. https://www.youtube.com/watch?v=Ml6-w1mL9BM&t=4s

# Рэзюмэ




*ЦІП на Акрэсціна. Фота Еўрарадыё*

У аснову гэтага даклада пакладзеная інфармацыя са сведчанняў 101 пацярпелага (1095 старонак дакументаў), якія 9–14 жніўня 2020 года ўтрымліваліся ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў у 1-м завулку Акрэсціна, 36 у Мінску. Для мэтаў публікацыі многія са сведкаў былі апытаныя дадаткова. Таксама эксперты Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі старанна вывучылі дадзеныя апытанымі медыцынскія і іншыя дакументы.

У гэтай публікацыі ў храналагічным парадку прыводзіцца апісанне знаходжання затрыманых у ЦІП, а таксама ўмоваў, у якіх яны ўтрымліваліся. Фокус зроблены на асноўныя лакацыі: двор ЦІП, дзе людзей выгружалі з аўтазакаў; прагулачныя дворыкі, дзе іх па 2–3 гадзіны і болей трымалі да размеркавання па камерах (некаторыя знаходзіліся там некалькі сутак); камеры і калідоры ЦІП. У любым месцы ізалятара людзі сутыкаліся з жорсткім збіццём, псіхалагічным ціскам і абразамі з боку супрацоўнікаў ЦІП (у тым ліку медыцынскіх супрацоўнікаў), а таксама сілавікоў з іншых падраздзелаў праваахоўнай сістэмы краіны.

Затрыманыя сведчаць пра неверагодную перапоўненасць камераў, у якіх іх утрымлівалі, антысанітарыю і адсутнасць элементарных рэчаў для туалету і гігіены, пітной вады і ежы на працягу некалькіх сутак, нягледзячы на ўсталяваныя нормы і правілы ўтрымання[7].

Мэтанакіравана ўтрымліваючы людзей у перанаселеных камерах у разгар пандэміі Covid-19, супрацоўнікі ЦІП падстаўлялі пад небяспеку іх здароўе і жыцці. Хворыя і тыя, хто мае патрэбу ў пастаянным прыёме медыцынскіх прэпаратаў, а таксама траўмаваныя і параненыя не атрымлівалі неадкладнай медыцынскай дапамогі, што скончылася цяжкімі наступствамі для здароўя многіх з іх (гл. раздзел Збіццё, траўмы і пашкоджанні людзей). Хуткую медыцынскую дапамогу затрыманым выклікалі ў выключных выпадках.

Умовы ўтрымання ў ЦІП расцэньваюцца экспертамі Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі як жорсткія, а ў некаторых выпадках гэтыя ўмовы дасягалі ўзроўню катаванняў.

Масавае збіццё, псіхалагічны і фізічны гвалт з боку супрацоўнікаў сілавых структураў, у тым ліку супрацоўнікаў ЦІП, суправаджалі затрыманых на працягу ўсяго часу іх знаходжання ў ізалятары.

7. https://minsk.mvd.gov.by/ru/news/4411

Хуткабежныя суды, якія праходзілі над затрыманымі ў будынку ЦІП, не адпавядалі прынцыпам справядлівага суду. Людзям не давалі магчымасці азнаёміцца з пратаколамі затрымання, у многіх выпадках інфармацыя ў іх была няправільная і прыдуманая. У наданні адваката адмаўлялі, часам за гэтае патрабаванне збівалі.

Пры такіх абставінах адлюстраваныя ў гэтым дакладзе дзеянні сілавікоў АМАП і ЦІП ГУУС Мінгарвыканкама ў дачыненні да затрыманых людзей з'яўляюцца злачыннымі як па ўнутраным, так і па міжнародным праве (гл. раздзел Прававая кваліфікацыя дзеянняў супрацоўнікаў праваахоўных органаў).

Аналіз інтэрв'ю пацярпелых і дадатковыя апытанні з мэтай апазнання сілавікоў дазволілі ідэнтыфікаваць некаторых службовых асобаў ЦІП, якія прымалі ўдзел у катаваннях і жорсткім абыходжанні з затрыманымі (гл. раздзел Асобы, адказныя за катаванні затрыманых у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў).

З прычыны няспынных рэпрэсіяў у дачыненні да пацярпелых у дакладзе не прыводзяцца іх сапраўдныя імёны і прозвішчы і пазбягаюцца апісанні, з дапамогай якіх можна ідэнтыфікаваць людзей. Цытаты з інтэрв'ю пацярпелых у дакуменце выдзеленыя курсівам.

Дадзеная публікацыя з'яўляецца яшчэ адным дакументальным сведчаннем злачынстваў супраць чалавечнасці, зробленых рэжымам пасля выбараў прэзідэнта ў Рэспубліцы Беларусь у жніўні 2020 года.

Неабходна адзначыць, што жорсткія ўмовы ўтрымання ў ЦІП і стаўленне да затрыманых, якія можна прыроўніваць да катаванняў, са жніўня 2020 года па цяперашні час[8] практычна не змяніліся. Гэта пацвярджаюць шматлікія сведчанні пацярпелых, якія адбывалі адміністратыўныя арышты ў дадзенай установе ў 2021–2023 гадах.

Адным з абуральных прыкладаў катаванняў у дачыненні да затрыманых з'яўляецца факт здзекаў з праваабаронцы Насты Лойка, якая заявіла ў судзе, што 11 лістапада 2022 года адзін з супрацоўнікаў ЦІП вывеў яе ва ўнутраны дворык і пакінуў без верхняй вопраткі на восем гадзінаў. У выніку гэтага Наста моцна захварэла[9].

8. Люты 2023 года
9. https://news.zerkalo.io/life/26113.html

# 9 жніўня 2020 года

## Заканчэнне галасавання на выбарах прэзідэнта. Затрыманні ў Мінску

На працягу ўсяго дня галасавання 9 жніўня ў Мінску праходзілі кропкавыя затрыманні — шмат каго забіралі проста з выбарчых участкаў. У асноўным гэта былі незалежныя назіральнікі і мясцовыя актывісты. У горадзе людзей затрымлівалі АМАП, САХР, міліцыя і іншыя падраздзелы сілавікоў. Затрыманых дастаўлялі ў РАУС горада, там фальсіфікавалі пратаколы, пасля чаго адвозілі ў ізалятар на Акрэсціна і іншыя месцы ўтрымання. Аднак некаторых затрыманых, не дастаўляючы ў РАУС, везлі адразу ў ЦІП і іншыя месцы ўтрымання.

У гэты дзень ў ЦІП затрыманыя пачалі паступаць у прамежку 18:00–20:00 гадзінаў. Пасля 22:00 гадзінаў колькасць людзей, якіх дастаўляюць, хутка павялічылася. Большасць з іх прывозілі ў аўтазаках і невялікіх гарадскіх аўтобусах.

## 19:00 — 24:00

### Двор ЦІП, “калідор” з сілавікоў




***Схема ўнутранага дворыка ЦІП на Акрэсціна. Малюнак аднаго з затрыманых.***
***Фота з сайта:*** *[https://www.currenttime.tv/a/belarus-minsk-okrestina/30881162.html](https://www.currenttime.tv/a/belarus-minsk-okrestina/30881162.html)*

Усіх, каго прывозілі ў ЦІП на Акрэсціна, выгружалі з транспарту ў двары. Частку затрыманых сілавікі заводзілі ў будынак цэнтра ізаляцыі. Тых, хто заставаўся ў двары, ставілі ўздоўж плота тварам да сцяны з нізка апушчанай галавой.

Пацярпелы, якога каля 21:00 даставілі з РАУС на Акрэсціна, апісаў тое, што ён убачыў у двары ў першыя хвіліны пасля прыбыцця:

> *“Я бачыў, што на вуліцы ўздоўж плота на каленях стаялі людзі, чуў іх крыкі, і было зразумела па гуку, што ім наносяць удары дубінкамі. Далей я ўбачыў дзяўчат,*

*якія стаялі тварам да сцяны, нам таксама сказалі апусціць галаву, то бок не глядзець. Нас таксама паставілі тварам да сцяны".*

Пасля выхаду з аўтазака затрыманых праганялі праз "калідор" з сілавікоў. Пацярпелыя апісваюць, што ім даводзілася бегчы з завязанымі рукамі, апушчанай галавой, у паўпрыседзе міма людзей у чорнай форме, якія стаялі па абодва бакі і неміласэрна збівалі іх дубінкамі**.**

*"Калі я развярнуўся, на ўзроўні маіх вачэй была назіральная адтуліна [у аўтазаку], я мог бачыць выхад. Я ўбачыў так званы 'калідор', калі затрыманых выводзілі, іх усіх збівалі".*

Затрыманыя выбягалі з аўтазакаў, некаторы час беглі праз "калідор" з сілавікоў і станавіліся каля будынку, тварам да сцяны, рукі ззаду. На ўсе пытанні і просьбы (пра ваду, меддапамогу, адваката) ім у адказ ішлі ўдары дубінкамі, берцамі.

Перад уваходам у памяшканне былі расстаўленыя сталы, на якіх павінен быў праводзіцца агляд з вопісам асабістых рэчаў. Пакуль людзі рухаліся ўздоўж сцяны, ім далі каманду здымаць гадзіннікі, бранзалеты, пярсцёнкі, ланцужкі, тэлефоны, даставаць шнуркі з красовак, папругі. Сілавікі забаранялі глядзець куды-небудзь — ім у твар, у бок, круціць галавой. Калі хтосьці сустракаўся позіркам з сілавікамі, яго неадкладна збівалі дубінкамі.

Некаторым затрыманым "пашанцавала" больш — іх не праганялі праз "калідор" з дубінак. У 23:30 групу людзей паставілі ўздоўж сцяны з іншага боку ад плота і пачалі перапісваць дадзеныя. Адзін хлопец спрабаваў патлумачыць, што ён замежны грамадзянін. Супрацоўнікі яму адказвалі: *"Стой, блядзь, я табе сказаў. Я табе зараз пакажу, блядзь! Заткнуўся! Стаяць, блядзь! Паварочвайся! Сука!"* Пазней замежных грамадзянаў (такіх было некалькі) аддзялілі ад астатніх.

Далей сілавікі пачалі дзейнічаць больш жорстка. Практычна ўсіх, хто прыбываў, неміласэрна збівалі ўжо пры выхадзе з аўтазакаў.

*"Нам загадалі стаяць на каленях на бетоннай падлозе з паднятымі рукамі, упёртымі ў сцяну. У мяне рукі былі па-ранейшаму сашчэпленыя ззаду. Так мы стаялі гадзіну ці паўтары, чакалі пакуль прыедуць іншыя аўтазакі з затрыманымі. Калі яны прыбылі, нам сказалі паўзці на каленях улева па перыметры. Паўзлі па шкле, па камянях, увесь гэты працэс суправаджаўся ўдарамі дубінак. Гэта было доўга. Калені і агулам ногі зацяклі і рухацца было надта складана. Ува ўсіх ногі былі сцёртыя да крыві. Калі дрэнна поўз, атрымліваў удары дубінкамі па спіне. Часам білі проста праходзячы міма, без аніякай прычыны".*

У яркім святле пражэктараў людзі выбягалі з аўтобусаў і, сагнуўшыся, беглі да сцяны.

*"Гэта было дваццаць ці трыццаць, можа, сорак метраў. Ад сцяны да аўтазака была чарга, і пакуль мы беглі, нас білі дубінкамі. ...сабакі там былі, аўчаркі, падаецца, таму што пухната чорна-карычневыя пашчы былі ў іх і яны клацалі ля самага твару. ... каля сцяны мы ўсталі, і трэба было стаяць на каленях, рукі ўверх, галаву ўніз".*

Уздоўж другой сцяны-плота таксама стаялі людзі, каля 50 чалавек. Тыя, хто прыбывалі, адзначалі, што яны там знаходзіліся ўжо дастаткова доўга: хто стаяў, хто ляжаў, пасярэдзіне газона ляжаў мужчына ўвесь у крыві, побач з ім стаяла хуткая медыцынская дапамога.

Некаторых з тых, хто прыбываў, афармлялі хутка (перапісвалі пашпартныя дадзеныя), адбіралі асабістыя рэчы і адразу разводзілі па камерах. Людзей было шмат, таму іх размяшчалі літаральна ва ўсіх прыдатных для гэтага памяшканнях. Некаторыя пацярпелыя распавядалі, што па прыбыцці іх загналі ў падвал, дзе знаходзілася ад 70 да 100 чалавек.

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

Затрыманых размяшчалі ў дворыках для прагулак адміністратыўна арыштаваных асобаў. Па іх апісаннях, “дворык для прагулак — гэта бетонны пакой чатыры на пяць метраў, зверху накрыты кратамі. Ячэйка кратаў — прыкладна адзін пачак цыгарэтаў, пачак цыгарэтаў — дзесяць сантыметраў”.




***Прагулачны дворык ЦІП.***
***Фота з сайта*** [https://www.the-village.me/village/city/cityguide/284613-jail-prison](https://www.the-village.me/village/city/cityguide/284613-jail-prison)

Дворыкаў для прагулак было некалькі. У іх было вельмі шмат людзей. Спачатку туды змяшчалі па 20 чалавек, але па меры прыбыцця новых затрыманых — і да 70. Людзі стаялі літаральна ўпрытык адно да аднаго, як у перапоўненым транспарце. Прысесці ці легчы было немагчыма. У прыбіральню выводзілі па тры чалавекі.

> *“У прагулачных дворыках нас раскідвалі па 50–60 чалавек. Мяне пераявялі ў другі прагулачны ‘калодзеж’. Там я бачыў у чалавека такія раны ад куляў, як слоікі, якія ў дзяцінстве ставілі: кропкі вялізныя, і яны крываточылі, бачна было, што яны свежыя, таму што вадзяністасць такая была”.*

> *“Зверху там ходзіць дзядзька, кажа: ‘Я зараз гранату вам сюды кіну і вам усё будзе’. Я разумею, што ў гэты момант, семдзесят чалавек, калі сюды трапіць граната, то гэта адразу ўсё…”*

Пагрозы, якія паступалі ў іх бок, большасць пацярпелых успрымалі як рэальныя. Сітуацыя была вельмі псіхалагічна напружаная і нервовая, затрыманыя адзначалі, што ў гэты момант сілавікі былі гатовыя на любыя экстрэмальныя дзеянні.

## Камеры, калідоры ЦІП

Затрыманыя стаялі ў калідоры ў чаканні дагляду: жанчынам загадалі стаяць “далонькамі да сценкі”, а мужчынаў ставілі на расцяжку — ногі па максімуме шырэй за плечы. Потым па некалькі чалавек адводзілі на дагляд. Падчас гэтай працэдуры трэба было распрануцца дагала і некалькі разоў прысесці. Нягледзячы на тое, што гэта быў асобны пакой, ніякай прыватнасці забяспечана не было.

Некалькі пацярпелых распавядаюць пра эпізод каля кабінета дагляду. Як высветлілася падчас дагляду, адна з дзяўчат — трансгендар.

> *“З яе/яго пачалі здзекавацца, казаць, што ён підар. Гледзячы па дзеяннях супрацоўніка, я думаю, што ён сутыкнуўся з такім упершыню. Ён не ведаў, што*

*рабіць, як дзейнічаць з гэтым чалавекам: (ставіць як мужчыну на расцяжку) ці як жанчыну (далонькамі ў сценку). Ён спытаў у кагосьці, і той чалавек сказаў, што 'гэта ж підар, стаў яго як мужыка'. Яго ў жорсткай форме паставілі на расцяжку і далі дубінкай".*

Пасля дагляду людзей размяркоўвалі па камерах. Але, перш чым дайсці да камеры, трэба было хутка прабегчы праз калідор, па перыметры якога стаялі сілавікі і збівалі тых, хто бег.

Першых затрыманых пачалі размяшчаць у камерах на першым, другім, трэцім і чацвёртым паверхах прыблізна ў 22:00–23:00.

У камерах паступова дадаваліся ўсё новыя і новыя людзі. Пацярпелыя распавядаюць пра жахлівую перапоўненасць: 22 чалавекі ў чатырохмясцовай камеры; 30 чалавек у шасцімясцовай; 42 чалавекі ў камеры, прызначанай для васьмі чалавек; 24 чалавекі ў двухмясцовай.

*"Я быў у чатырохмясцовай камеры, там стаялі два двухпавярховыя ложкі. Спачатку нас там было 12 чалавек, але ўвесь час транспарт з затрыманымі прыбываў... І кожныя хвілінаў 20 дадаваліся новыя людзі".*

*"Прыбіральні часта былі забітыя ці ўвогуле не працавалі. Вада была толькі халодная, але і яна была вельмі дрэннай якасці — мы яе адстойвалі, таму што знізу збіраўся добры слой іржы ці бруду".*

Усю ноч працягвалася паступленне новых людзей, у камерах пастаянна былі чутныя крыкі, гукі збіцця, абразаў і пагрозаў. Спаць затрыманыя не маглі, у памяшканнях пастаянна гарэла святло.

*"Ты сядзіш, і ўсё, што ты чуеш, — гэта ўдары дубінкай, стогны, крыкі, пакуль чалавек проста не затыкаецца і не крычыць". Некаторыя камеры некалькі разоў за ноч выводзілі на дагляды: "Калі нас выводзілі на допыт, вось мы стаялі тварам да сцяны. Яны крычалі: 'Тварам да сцяны! Вочы ў падлогу! Калі хтосьці павернецца — атрымае!' Пастаянна вось на гэтым негатыве, з дзікім крыкам. То бок абыходжанне з намі было, як з сабакамі".*

# 10 жніўня 2020 года

Па расповедах пацярпелых, 10 і 11 жніўня 2020 года былі самымі жорсткімі ў ЦІП. Туды прывозілі значна больш людзей, чым напярэдадні. Тым, хто сядзеў у камерах, было чуваць, як па-зверску збіваюць новадастаўленых затрыманых. Сілавікі бясчынствавалі на працягу ўсяго дня.

> *"Кожную ноч я чуў здзекі, якія адбываліся ў двары ЦІП. Людзі стагналі і крычалі. Іх прымушалі крычаць: 'Мы любім АМАП'. Іх прымушалі спяваць гімн Беларусі. Было вельмі страшна слухаць гэта".*

> *"Адна супрацоўніца папрасіла: 'Надзеньце гэтых хлапцоў на вашыя дубінкі'. Гэта была мэтанакіраваная атака на людзей. Усе былі максімальна агрэсіўна настроеныя: 'Колькі вам плацяць?', 'Жывёла!', 'Мы вас тут усіх зараз пазабіваем!' Было адчуванне, што самі супрацоўнікі знаходзяцца ў наркатычным ап'яненні".*

## 00:00 — 07:00

### Двор ЦІП

Затрыманых, выгрузіўшы з аўтазакаў, праганялі праз "калідоры" з АМАПа ва ўнутраным двары ЦІП. Стаяла па восем-дзесяць сілавікоў з кожнага боку — у шахматным парадку. Людзі беглі паміж імі, а яны іх збівалі дубінкамі. Потым усіх ставілі тварам да сцяны, загадвалі апусціць галаву, пакласці рукі на сцяну і стаць на калені.

Калі не падабалася, як стаіць чалавек, яго без папярэджанняў збівалі дубінкай. Далей людзей заводзілі ўнутр будынка, там трэба было зняць папругі, шнуркі, здаць асабістыя рэчы.

Сярод затрыманых было шмат акрываўленых хлапцоў, параненых гранатамі і гумовымі кулямі, некаторыя былі збітыя да сіні. Многія людзі стаялі паўголыя, у адных трусах. Так яны правялі па дзве-тры гадзіны.

Шмат затрыманых прывезлі ў ЦІП каля 03:30. Іх таксама паставілі ў доўгі шэраг уздоўж плота ў двары. Пацярпелыя стаялі на каленях на зямлі да самага світанку, калені іх былі разбітыя да крыві ў дадатак да атрыманых пры затрыманні траўмаў. Піць ім не давалі, у прыбіральню не вадзілі. З першых хвілінаў затрымання людзям далі зразумець, што ніякіх правоў у іх няма. У аднаго затрыманага на руцэ была белая стужка і, звярнуўшы на яе ўвагу, сілавік сказаў занесці яго ў асобны спіс, паколькі гэтую стужку яму павінны "зрэзаць са скурай".

> *"Супрацоўнікі крычалі, абзывалі, прыніжалі: 'Мразі!', 'Трэба было дома сядзець!', 'Пераменаў захацелася?', 'Жывёлы!'. Спачатку стаялі рукі ўверх на каленях, потым сказалі рукі за спіну на каленях і галаву як можна ніжэй да зямлі. У такім становішчы стаяць цяжка".*

Тых, хто варушыўся, збівалі дубінкамі. Да раніцы ля сцяны стаяла ўжо каля 100 чалавек. Стаяць на каленях на тратуарнай плітцы і зямлі 30-40 хвілінаў траўмаваным людзям было цяжка і балюча. Апытаныя распавядаюць пра вялікую колькасць акрываўленых людзей вакол сябе. Мужчына пажылога ўзросту тросся з-за высокага ціску, магчыма, ад стрэсу. Адзін сілавік дазволіў яму ўстаць на ногі, аднак іншы падышоў і ўдарыў яго па нагах дубінкай. Мужчына ўпаў.

Псіхалагічная атмасфера ў гэтую ноч была надта напружаная. Сілавікі ў двары ЦІП з кожнай гадзінай літаральна звярэлі. Любыя іх дзеянні, нават фармальныя — перапіс персанальных дадзеных, вопіс рэчаў — суправаджаліся неймавернай грубасцю і жорсткасцю ў дачыненні да затрыманых.

> *"Людзі вельмі моцна крычалі... Я разумеў, што нельга крычаць — таму што*

*для іх сігнал, што жывы, і можна біць. Людзі, якіх прывозілі і настолькі моцна збівалі, што маўчаць яны ўжо проста не маглі".*

Дзеянні сілавікоў падтрымліваліся і ажыццяўляліся, па ўсёй верагоднасці, па загадзе вышэйшага кіраўніцтва. Пацярпелыя распавядалі, што ў гэтую ноч у двор ЦІП прыехала нейкае начальства, якое назірала за тым, што адбывалася.

*"Гэта было недзе 4–5 чалавек гадоў 50-ці. ...і адзін з іх сказаў: 'Мне б зараз аўтамат, я б вас, сукі, усіх расстраляў'. Вось гэта было ўжо страшна. Там яшчэ хадзіў чалавек у лічбавай форме вайсковай, у яго была маска і вінтоўка. Было зразумела, што дастаткова сур'ёзная зброя і што любое непадпарадкаванне можа расцэньвацца як напад..."*

Затрыманых гналі па двары ўстановы, як скаціну, усё трэба было рабіць хутка, таму што на ўездзе стаяла чарга з аўтазакаў.

*"Людзі прыязджалі збітыя, без штаноў, без абутку, з рассечанымі тварамі і галовамі, з выбітымі зубамі, тварамі з ацёкамі. Спіны і ногі ўва ўсіх былі сінія. Сілавікі не рэагавалі на просьбы людзей пра дапамогу. Там проста стаяў крык з матам: 'Сукі, закрыйце пашчу!' Ніякай павагі, ніякай чалавечнасці там не было".*

Пацярпелыя распавядаюць пра чалавека, у якога не згіналася спіна і яго пастаянна збівалі за гэта.

Такая працэдура "прыёмкі" затрыманых працягвалася на Акрэсціна ўсю ноч.

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

*"Дворык — гэта чатыры бетонныя сцяны, дзверы сталёвыя з вочкам, 'кармушка' для выдачы ежы, столь — гэта неба ў клетачку, краты".*

Пацярпелых ставілі на калені на бетонную падлогу, рукі за спіну, давалі ім поліэтыленавыя пакеты і загадвалі распранацца. Тых, хто рабіў гэта недастаткова хутка ці не так, як гэта патрабавалі сілавікі, неміласэрна збівалі дубінкамі.

*"Адзін з затрыманых паспрабаваў устаць, каб зняць штаны, але яго ўдарылі дубінкай і прымусілі распранацца на каленях".*

Як апісваюць пацярпелыя, у прагулачных дворыках скаплівалася шмат людзей. Па іх ацэнках, на дваццаці квадратных метрах магло быць ад сямідзесяці пяці да ста чалавек.

*"У аднаго хлопца не было абутку, ён стаяў доўга, а потым папрасіў іншых хлапцоў яму дапамагчы. Хтосьці даў яму шкарпэткі, хтосьці — вусцілкі, каб ён пад шкарпэткі іх надзеў".*

Многія апытаныя адзначаюць, што ў прагулачных дворыках яны мелі вялікую патрэбу ў вадзе. Аднак у першыя гадзіны знаходжання вады не давалі ўвогуле, пазней давалі вельмі мала, літаральна адну пластыкавую бутэльку паўтары-два літры на ўсіх, то бок на 75 — 100 чалавек.

Пацярпелыя мелі патрэбу ў тэрміновай медыцынскай дапамозе з-за раненняў рознай ступені цяжару. Аднак медыцынская дапамога не надавалася.

Затрыманыя распавядалі, што сілавікі ў дворыках пастаянна нагняталі псіхалагічную абстаноўку. Любыя свае дзеянні яны суправаджалі не толькі збіццём, але і грубымі крыкамі, абразамі і прыніжэннямі.

*"І гадзіна палітінфармацыі праходзіла — 'Пачвары, ніякай больш плошчы, вы ўсе на алоўку! Калі вы яшчэ раз сюды трапіце, мы вас будзем забіваць, забудзь-*

*цеся пра гэтую плошчу!' Пры гэтым праходзіліся дубінкамі. У мяне гематомы ў асноўным на ягадзіцах".*

## Камеры, калідоры ЦІП

*"Спаць было немагчыма, таму што ўсю ноч былі пякельныя крыкі людзей, гукі ўдараў дубінкамі, прашэнні пра літасць. Чулі, як прыязджалі МАЗы. З гучнымі крыкамі: 'Давай, блядзь, выходзь хутчэй, блядзь, пабег, пабег, давай'. Камера была на другім паверсе і вокны яе выходзілі ва ўнутраны дворык, усё было чуваць".*

Пасля дагляду і афармлення затрыманых размяшчалі па камерах. З-за вялікай колькасці людзей усе камеры былі перапоўненыя. Жорсткія ўмовы ўтрымання ў іх дадавалі пакутаў збітым і траўмаваным людзям.

Людзі прыязджалі з мноствам ранаў рознага паходжання, траўмаваныя гумовымі кулямі, з пераломамі рук і ног. Затрыманыя паступалі ўсю ноч.

Сярод затрыманых было шмат дзяўчатаў. Іх зводзілі на трэці паверх.

*"Мы чулі, што заводзілі дзяўчатаў, іх сілавікі не збівалі. Але часам з'яўлялася супрацоўніца (Крысціна да яе звярталіся), і вось дзяўчат біла яна, крычала 'што там жопы выставілі' (казала тым, хто не так сагнуўся). Таксама праходзілася па іх дубінкамі".*

Замежнікаў заводзілі на чацвёрты паверх. Як распавядалі апытаныя, калі сілавікі даведваліся, што затрыманыя з Расіі ці Украіны, іх моцна збівалі.

*"Чуў, што некаторыя хлопцы казалі, што яны з Украіны. Як толькі гэта пачуюць, фразы былі адны і тыя ж: 'Што вы сюды прыехалі?! Сваю краіну развалілі, сюды прыехалі разваліць! Майдан захацелі? Цалуй, пачвара, беларускую зямлю!'"*

Адзін з апытаных знаходзіўся ў чатырохмясцовай камеры, дзе было 28-30 чалавек. Уначы ў камеры было прахалодна, а ўдзень горача і душна. Не хапала кіслароду, і ад гэтага ў многіх кружылася галава. Адзінай крыніцай паветра было крыху прыадчыненае вакно. Людзі стаялі ў чарзе і мяняліся месцамі, каб хоць крыху падыхаць.

*"Калі мужчыну, які знаходзіўся ў маёй камеры, стала дрэнна, мы націснулі кнопку выкліку супрацоўніка. Супрацоўнік спытаў: 'Што ў вас?'. Мы сказалі, што ў нас мужчына губляе прытомнасць і яму дрэнна. Нашую камеру адчынілі і вывелі гэтага мужчыну. Жанчына-лекар, якая яго аглядала, сказала, што калі ён губляе прытомнасць, то няхай падае. Ён ледзь стаяў на нагах і яго трымаў супрацоўнік, каб ён не ўпаў на падлогу. Пад абразы лекара і смех у наш бок да нас вярнулі мужчыну, не надаўшы яму дапамогі. У яго быў слабы пульс".*

У камерах пастаянна гарэла святло. Спаць было немагчыма з-за пастаянных крыкаў і стогнаў людзей. У дадатак да гэтага сілавікі стукалі дубінкай па дзвярах і крычалі, каб людзі не клаліся спаць. Іх пастаянна запалохвалі, што "выведуць у двор", калі яны парушаць іх патрабаванні.

Практычна ўсе апытаныя адзначаюць, што камеры ў гэтыя дні былі перапоўненыя ў 5–7 разоў (у трохмясцовай камеры было 13 чалавек, у пяцімясцовай — 20–25). Адзін з затрыманых распавёў пра сваё знаходжанне ў шасцімясцовай камеры, у якой было 50 чалавек.

З-за перапоўненасці камераў умовы там былі невыноснымі. З мэблі — пара тумбачак, металічныя ложкі без матрацаў, падушак і пасцельнай бялізны. Са сцяны тырчаў кран, з якога людзі маглі папіць.

Ляжаць адначасова маглі, нават з улікам месца на падлозе, чалавек 20–25. Астатнія маглі толькі

сядзець. Людзі спрабавалі сачыць за станам навакольных — калі камусьці дрэнна, то рабілі ратацыі, укладвалі гэтага чалавека паляжаць. Пры поўнай адсутнасці матрацаў усе ляжалі або на падлозе на сваёй вопратцы, або на металічных ложках.

*“Хтосьці стаяў, хтосьці ляжаў пад ложкам, хтосьці па тры чалавекі на адным ложку, спалі хто як мог. Такім складам правялі двое сутак”.*

Паколькі паветра ў камерах не хапала, там была вельмі высокая вільготнасць. Затрыманыя шмат разоў прасілі адчыніць “кармушку”, але сілавікі на просьбы не рэагавалі. Саслабелыя людзі трацілі прытомнасць.

*“Аднаму чалавеку стала дрэнна. На другія суткі яго забралі. У яго нешта з сэрцам было, прытомнасць траціў, таму што душна было. Але яго не завезлі ў бальніцу, а прыкулі кайданкамі ў калідоры”.*

*“Дыхаць можна, але, у нейкі момант ты ўжо ў такім стане, амаль траціш прытомнасць, таму што кіслароду мала, вокны не адчыняліся з-за гэтых кратаў. Шчыліна — 5 см прыблізна, праз яе паветра паступала, але як бы, рэальна яго дастаткова мала, таму задыхаліся”.*

Многія затрыманыя распавядаюць пра бесчалавечнае стаўленне сілавікоў у ЦІП да параненых і хворых людзей. Медыцынская дапамога не надавалася. Толькі ў выключных выпадках, пасля настойлівых просьбаў, пры пагрозе яўнай смерці людзей забіралі з камераў.

*“У аднаго ў назе тырчэў аскепак ад гранаты, але ніякай дапамогі яму не надавалі, на просьбу пра дапамогу адказвалі: ‘Засунь сабе гэты аскепак у жопу’”.*

*“Адзін чалавек прасіў лекара пастаянна, таму што ён быў жорстка збіты, у яго спіна была сіняя, ён казаў: ‘Патрэбны лекар, таму што я не магу хадзіць’. Ён не мог хадзіць, таму што ў яго былі зламаныя рэбры. Лекара так і не далі”.*

*“Ува ўсіх былі сінякі, удары, але ніхто не прасіў пра дапамогу, таму што ніхто не хацеў атрымаць лішні ўдар дубінкай. У аднаго з людзей былі ваніты, ён прасіў лекара, але да яго ён так і не прыйшоў”.*

*“Пасля дагляду ў меня вельмі моцна разбалелася галава, з правага боку балелі рэбры. Я папрасіў паказаць меня лекару. Спыталі, што ў мяне, і адказалі, што трэба везці на рэнтген, гэтага ніхто рабіць не будзе, ты вялікі і пацерпіш. ...у мяне былі галюцынацыі, перад вачыма ўсё плавала”.*

У адной з чатырохмясцовых камераў знаходзілася 19 жанчынаў. Адну з іх за “лішнія” пытанні сілавікам сур’ёзна збілі і прыгразілі, што яна “згніе ў камеры”. Жанчыны і дзяўчаты ў камеры былі моцна напалоханыя тым, што адбывалася.

*“АМАПавец ударыў жанчыну галавой аб сцяну, а жанчына-бландзінка загадала скласці пальцы ў замок, завесці іх за галаву. У гэты час ударамі сваіх берцаў працягвала рваць ёй пахвінныя звязкі, пачала выкручваць ёй правую руку, пасадзіла на калені, прыціснула сваёй нагой галаву жанчыны да падлогі і пачала крычаць: ‘Кажы, сука, свае дадзеныя!’”*

Увесь гэты час жанчынаў не кармілі, ваду яны пілі з-пад крана, з “прыбіральні” жахліва смярдзела.

Жанчыны прасілі адчыняць “кармушку”, таму што паветра ў камеры не хапала, але ў адказ чулі толькі адмовы. Дзяўчаты апісваюць, што яны былі ў паўнепрытомным стане, думкі блыталіся, увесь час хацелася спаць. Яны засыналі, драмалі 15–20 хвілінаў і рэзка прачыналіся[10].

10. Рэакцыя арганізма на недахоп кіслароду, актыўны ўдых і прабуджэнне, калі чалавек знаходзіцца на мяжы страты прытомнасці з-за недахопу ў клетках кіслароду.

У адной дзяўчыны пачалася панічная атака, яе бесперапынна ванітавала, яна траціла прытомнасць. Іншая дзяўчына — інвалід-эпілептык. Яшчэ адна жанчына была хворая на дыябет другога тыпу, трое сутак яна прасіла прынесці ёй таблеткі з турмы, але безвынікова. У многіх дзяўчат пачаўся моцны кашаль ад пераахалоджвання ў выніку стаяння і сну на бетоннай падлозе. Жанчыны шматразова прасілі пра атрыманне медыцынскай дапамогі тым, хто мае патрэбу, але ў адказ чулі толькі адмовы.

> *"У той жа час за сценкай мы чулі, як працягваюць збіваць мужчынаў — яны хрыпелі, крычалі, плакалі. Аднаго з мужчынаў збілі да такога стану, што ён абмачыўся з крывёю. Супрацоўнікі крычалі на яго, каб ён сабой жа выцер мачу з крывёю з падлогі і прыбраў за сабой. Мужчына плакаў і казаў, што яму няма чым выцерці, паколькі ён голы... Сілавікі, не спыняючыся, працягвалі яго біць і крычаць, каб ён усё выцер сваім целам".*

Бліжэй да раніцы крыкі і гукі збіцця пачалі сціхаць. Тыя з затрыманых, хто знаходзіўся ў камерах, нават змаглі заснуць.

Каля 06:00 тых, каго ўтрымлівалі ў камерах на другім паверсе, пачалі будзіць — супрацоўнікі ЦІП у калідоры крычалі: *"Устаць, жывёлы!"*.

Рана раніцай на другім паверсе пачалася працэдура афармлення пратаколаў. Кожную камеру па чарзе выводзілі ў калідор і ставілі ўздоўж сценкі. Адначасова ў вузкім калідоры стаяла больш за трыццаць чалавек. Стаяць трэба было з шырока расстаўленымі нагамі і нізка апусціўшы галаву, трымаючы рукі за спінай.

> *"Ты выходзіш — ногі на шырыні, рукі на сцяну, галаву ў падлогу, калі камусьці з тых, хто цябе выводзіў, гэта не падабаецца, яны могуць падысці дубінкай даць, сказаў 'ногі шырэй, мразь!'. У аднаго з затрыманых былі меліраваныя валасы, з-за гэтага адзін з супрацоўнікаў ударыў яго галавой аб сцяну са словамі 'Ты што, баба?'".*

Затрыманых па чарзе выклікалі падпісваць пратаколы. Калі хтосьці намагаўся вывучыць дакумент ці ўказаць на памылкі ў ім, яго пачыналі абражаць, пагражаць, а таксама маглі збіць.

> *"На гэта [памылкі ў пратаколе] ён мне адказаў крыкам 'падпісвай', на што я адказаў, што мне трэба пачытаць. Мне адказалі: 'Пайшоў на хуй, тварам да сцяны і стой'. Я, нічога не падпісваючы, накіраваўся на сваё месца да сцяны. Пасля таго, як апошні чалавек падпісаў з надзеяй, што яго адпусцяць дадому, пачалася жэсць".*

Пасля падпісання пратаколаў усіх затрыманых адпраўлялі назад у камеры, суправаджаючы ўдарамі дубінак.

## 07:00 — 24:00

### Двор ЦІП

> *"Бліжэй гадзінаў да 8 раніцы было чуваць, што людзі бягуць, пачынаюцца крыкі, гукі таго, як б'юць дубінкай, абзываюць. Забягаюць людзі і ім крычаць: 'На калені, прыхінуцца галавой да сцяны!' Заламваюць... Іх збівалі значна мацней, чым нас, вельмі моцная была агрэсія".*

Дастаўленых у ЦІП выгружалі з аўтазакаў і праганялі праз "калідор". Іх збівалі дубінкамі каля 20 сілавікоў. Затрыманыя адзначаюць, што бачылі сінюю форму ДПСнікаў, амапаўцаў у чорнай форме. Разглядзець што-небудзь было складана, ім крычалі *«Галавой у падлогу!»* і наносілі ўдары па

спіне, па задняй частцы ног, падняцца было немагчыма. Тых, хто крыху вышэй уздымаў галаву, білі больш. У двары стаяў натоўп супрацоўнікаў ізалятара, яны былі ў звычайных сініх ці шэрых майках і чорных нагавіцах, у масках.

> *"Мы проста адно за адным беглі. З двух бакоў стаялі людзі з дубінкамі, якія нас білі гэтымі дубінкамі. Кагосьці больш, кагосьці менш. Хтосьці паспяваў прабегчы, камусьці больш даставалася.*
>
> *Супрацоўнікі пастаянна крычалі: 'Ябала ў падлогу!', 'Бегчы, блядзь!'. Кожны загад 'Хутчэй!' суправаджаўся ударам па нагах".*

Затрыманым заламвалі рукі, пастаянна чуліся крыкі і абразы ў іх бок. Мужчынам, якія выходзілі з аўтазака, імгненна наносілі ўдары з нагі ў жывот, пасля чаго чалавек ужо не разгінаўся і ў такім стане бег далей.

Адзін з затрыманых распавядае, што сілавікі мэтанакіравана білі мужчынаў у пахвіну, па нырках.

> *"Мне разбілі ногі ў розныя бакі амаль да шпагату, і два разы ён мне ўдарыў дубінай між ног. Калі я спытаў, за што, ён сказаў, каб я больш такіх не нараджаў...".*

У канцы "калідора" людзей збівалі з ног і ставілі на калені ля плота.

> *"Пад крыкі 'лічыце мурашоў, твар у зямлю, рукі за спіну, на каленях стойце' пачынаюць правяраць тэлефоны. Па выніку пачынаюць правяраць асабістыя рэчы, пачынаючы з заплечнікаў, торбаў і так далей. У хлопца быў бінт і перакіс вадароду. За гэта яму пару разоў прыляцела, ну таму што 'А навошта табе такое з сабой у мірны час?'".*

Падчас дагляду асабістых рэчаў сілавікі прыдзіраліся да любой дробязі: майка з незвычайным малюнкам, рукі не так трымае, усміхнуўся несвоечасова. Адказам былі ўдары ў галаву, па нагах і руках, абразы, пагрозы.

> *"Па выніку мы так прастаялі яшчэ, напэўна, хвілінаў 40. Мы прабягаем крыху далей, падрываемся і разумеем, што ногі не працуюць, не слухаюцца. Хлопец адзін падвярнуў нагу, спрабаваў неяк даскакаць, не асабліва атрымлівалася. І там было штосьці тыпу 'калідора' [сілавікі, якія збіваюць], але значна радзей, там ужо дзесьці на кожныя два метры стаяла па чалавеку і ці то пендаля давалі, ці то падпатыльніка, яшчэ што-небудзь, зноў прабеглі крыху далей. Пагроза ад сілавікоў: 'А, можа, мы каго-небудзь паказальна дубіначкай згвалцім?', але, на шчасце, гэта ўсё засталося на ўзроўні пагрозы, нічога далей не пайшло".*

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

> *"... нас праводзілі ў прагулачны дворык памерам недзе чатыры на чатыры з паловай метры. І ён хутка запаўняўся людзьмі. У гэтым дворыку нас апынулася шэсцьдзесят сем чалавек. У нейкі момант найбольш збітых, мы прасілі, каб іх вывелі і перадалі медыкам. Усіх астатніх пакінулі ў гэтым прагулачным дворыку. Я ведаю, што былі людзі з астмай у суседнім дворыку, было чуваць, што ў людзей прыступ астмы".*

Аналізуючы расповеды пацярпелых, можна зрабіць выснову, што ў кожным з прагулачных дворыкаў у гэты перыяд збіралася ад 73 да 84 чалавек. Людзі правялі там каля сутак (некаторыя ад 26 да 33 гадзінаў).

Затрыманыя спрабавалі паспаць нейкім чынам. Яны сядалі да сцяны ці ўпіраліся спінамі адно да аднаго. Месца было мала, калі 10 чалавек сядалі, то астатнія людзі маглі толькі стаяць, магчымасці

парухацца не было, ногі ў людзей зацякалі. Даводзілася пастаянна мяняцца месцамі — хтосьці стаіць, хтосьці сядзіць.

Па апісаннях затрыманых, у дворыку было шмат збітых людзей, у некалькіх хлапцоў была часткова “скальпаваная” скура на галаве, чалавек дзесяць былі з ранкамі, быў хлопец з вялізнай гематомай на шчацэ. Яшчэ ў аднаго мужчыны з роту ішла кроў. Затрыманыя папрасілі меддапамогу для яго і па сканчэнні гадзіны яго забралі да медыкаў.

Упершыню ваду затрыманым далі (2–3 літры на ўсіх) праз 19 гадзінаў пасля затрымання, упершыню пакармілі (1 булка хлеба на ўсіх) праз суткі. У прыбіральню пачалі вадзіць праз 17 гадзінаў пасля затрымання.

> *“Зноў жа, гэта была раніца, ужо светла, калі нам прынеслі ваду, гэта было, напэўна, літры тры з паловай. І нам на шэсцьдзесят сем чалавек прынеслі вось гэтыя тры з паловай літры вады. Уяўляеце, што гэта толькі можна было ледзь намачыць вусны”.*

> *“… ‘Я зараз абасцуся’. Яму кажуць: ‘Вось зараз ты выйдзеш адсюль, мы зробім так, што ты яшчэ і абасрэшся’. Зайшоў нейкі начальнік, чалавека вывелі, мы пачулі ўдары дубінак, яго назад запіхнулі”.*

Пасля гэтага нейкія патрабаванні і звароты да сілавікоў спыніліся. Калі хтосьці моцна хацеў у прыбіральню, затрыманыя давалі тыя бутэлькі, з якіх яны пілі, каб чалавек мог справіць патрэбу менавіта туды. Потым гэтыя бутэлькі апалосквалі, і калі камусьці дазвалялі выходзіць, у іх зноў жа набіралі ваду для піцця.

Людзі ў гэтай бетоннай камеры знаходзіліся ў псіхалагічным шоку, іх супакойвала толькі тое, што там іх не будуць біць.

## Камеры, калідоры ЦІП

Некаторых затрыманых з камераў на другім паверсе пачалі пераводзіць на трэці паверх. Да вечару гэтага дня большасць з затрыманых ужо суткі знаходзяцца без ежы і нармальнай пітной вады. Таксама аднаўляецца збіццё людзей як амапаўцамі ў чорным і ў балаклавах, так і супрацоўнікамі ЦІП у міліцэйскай форме. Адзін за іншым пачынаюць прыязджаюць аўтазакі з новымі затрыманымі, камеры запаўняюцца яшчэ больш.

> *“… было чуваць, што з іншых камераў людзей выводзілі. Яны стукалі — іх выводзілі і вялі на другі паверх. Там, на другім паверсе, іх збівалі, і таму гэта ўжо стала прымаўкай: ‘Калі будзеш сябе дрэнна паводзіць — пойдзеш на другі паверх’”.*

Зранку пачаўся працэс падпісання пратаколаў. Ён складаўся з таго, што затрыманых выводзілі, выстройвалі каля сценкі і казалі: *“Ці вы падпісваеце пратакол, вам даюць тры базавыя і вы ідзяце дадому, ці вы не падпісваеце пратакол і застаяцеся тут на незразумелы тэрмін і будзеце несці пакаранне”.* Пасля высветлілася, што гэта падман, нікога па апісанай схеме не адпускалі.

Некаторыя затрыманыя падпісвалі пратаколы не гледзячы. Хтосьці спрабаваў вывучыць свой пратакол. Яны падыходзілі да стала па двое, супрацоўнік закрываў змест пратакола і казаў: “Тут падпісвай”.

Удзень, з 10 да 17 гадзінаў, па словах большасці апытаных, было ціха і збіцця амаль не было.

**Увесь дзень 10 жніўня прайшоў у бясконцых удакладненнях дадзеных, людзі ў форме ці без формы хадзілі і ўдакладнялі, хто знаходзіцца ў камерах.**

Некаторыя дагляды затрыманых праходзілі на другім паверсе. Па словах адной з апытаных, туды

затрыманых вялі ў вельмі нязручнай позе — рукі павінны былі быць за спінай, галава апушчаная вельмі нізка. Падчас дагляду трэба было цалкам распрануцца, прысесці некалькі разоў. Пасля дагляду затрыманыя некаторы час стаялі на каленях у калідоры.

> *“І потым мы выходзім у калідор і ў мяне шок быў, што ў шэрагу голыя мужыкі, галава паміж каленяў, попай наверх, на каленях. І нас таксама на калені паставілі. На калені, ды яшчэ ў спіну тыкнулі гэтай дубінкай. Такое адчуванне, што расстраляюць зараз у патыліцу”.*

Пасля даглядаў людзей адводзілі ў перапоўненыя камеры. Па словах мужчынаў, прыпадала да 5–8 чалавек на месца. Жаночыя камеры таксама былі перапоўненыя ў 4–6 разоў; напрыклад, у шасцімясцовай камеры было 35 чалавек, у трохмясцовай — 13. Адна з затрыманых распавяла, што знаходзілася ў чатырохмясцовай камеры, у якой было 40–50 чалавек.

У камерах не было матрацаў, пасцельнай бялізны. Людзі спалі на падлозе, каля прыбіральні, таму што ў іншым месцы легчы не было дзе. Кругласуткава гарэла яркае святло.

> *“Першую ноч я заснула на падлозе каля дзвярэй галавой у тумбачцы, таму што мне неяк трэба было зрабіць цянёк сабе. І, што самае цікавае, на тумбачцы нейкая дзяўчына ўмудрылася таксама спаць”.*

У некаторых камерах жанчыны не маглі хадзіць у прыбіральню, паколькі брудная вада з яе выцякала проста на падлогу, яны былі вымушаныя збіраць яе ручнікамі. Ад гэтага стаяў страшэнны смурод, вентыляцыі не было.

Затрыманыя адзначаюць, што ў камерах на другім паверсе было вельмі брудна і не было элементарных сродкаў гігіены — туалетнай паперы, мыла. Жанчыны прасілі туалетную паперу, пракладкі, на што сілавікі прапаноўвалі ім скарыстацца майкай. Толькі аднойчы супрацоўніца ЦІП прынесла на ўсю камеру кавалачак ваты і рулон бінту. Дзяўчатам давялося выкарыстоўваць для гігіенічных мэтаў санітарныя маскі.

У камерах было вельмі горача, па сценах сцякаў кандэнсат. На другія суткі ахоўнікі ўжо адчынялі кармушку для таго, каб людзі не задыхнуліся. Вокны былі зачыненыя. Людзі распраналіся, многія сядзелі ў адных трусах.

> *“Мы прасілі адчыніць ‘кармушку’, каб быў хоць нейкі доступ паветра ў камеру. Аднак кармушка перыядычна зачынялася. У пакаранне за любыя патрабаванні супрацоўнікі вылівалі вядро вады ў камеру. Прычым, гэта паўтаралася неаднаразова”.*
>
> *“Гэтая камера была яшчэ меншая за нашу, а ў ёй ужо знаходзілася людзей у два разы больш, чым у нашай. І тэмпература паветра была… Ну ў нас было горача. У гэтай, у другой камеры, тэмпература паветра была яшчэ большая. Паветра не было, дыхаць увогуле немагчыма было. Вільготнасць была такая, што са столі капала. На сценах быў кандэнсат. Падлога слізкая ад вільгаці. Пры мне страцілі прытомнасць два чалавекі. Калі ўсё-ткі адчынілі дзверы, адзін з іх простаываліўся з камеры на падлогу калідора. Яго ванітавала, але на гэта ніхто не звяртаў увагу”.*

Сілавікі паводзілі сябе груба, звярталіся пераважна матам. Калі ім нешта не падабалася, у якасці пакарання вакенца для падачы ежы (кармушка) зачынялася і людзі зноў задыхаліся без доступу кіслароду.

Затрыманых увесь гэты час не кармілі. Толькі позна ўвечары ім пачалі выдаваць па адным бохане хлеба на 21–38 чалавек, то бок па 50 грамаў на кожнага. Гэты хлеб стаў першай вячэрай за суткі знаходжання ў ЦІП.

Па расповедах аднаго з пацярпелых, яго ў гэты дзень катавалі, патрабуючы паведаміць код доступу да тэлефона. Ён адмаўляўся.

> *“З мяне зрабілі кола — закінулі з-за спіны, як кола, ногі, рукі і надзелі кайданкі. 30–40 хвілінаў я трымаўся. Страціў прытомнасць. Ну, давялося потым сказаць код ад тэлефона. Самае страшнае — тое, што там былі асабістыя дадзеныя блізкіх”.*
>
> *“...быў хлопец, метры два ростам, бачна было, што ён фанат ці спартовец. У яго ўсе ногі былі адбітыя ззаду, у гематомах. Ён распавядаў, што яго доўга збівалі”.*

У камерах былі людзі, якія мелі патрэбу ў медыцынскай дапамозе, многім неабходныя былі рэгулярныя прыёмы медпрэпаратаў (сардэчныя, гарманальныя, антыдыябетычныя). На іх просьбы пра наданне медпрэпаратаў сілавікі не звярталі ўвагу. Толькі пасля доўгіх угаворванняў медыкі ЦІП аглядалі пацярпелых, але дапамога была няпоўная. У адной з камераў знаходзілася жанчына з дыябетам — у выніку дазволілі перадаць ёй інсулін з яе торбы.

> *“Яны зрабілі ласку даць ёй інсулін ейны ж. І што мяне ўразіла, нават ватку пашкадавалі ёй даць. Яна ж коле, там кроў, а там такая антысанітарыя. Яна кажа: ‘Дык дайце што-небудзь’. І ёй далі кавалак паперы нейкі”.*
>
> *Адной жанчыне пры затрыманні паранілі нагу, з яе кроў струменіла, і мы прасілі хаця б мінімальную апрацоўку. На гэта або не рэагавалі, або пасылалі, тыя ж самыя словы — ‘Трэба было дома сядзець, баршчы варыць’”.*

Некаторых дзяўчатаў ванітавала, у кагосьці пачаліся панічныя атакі.

Супрацоўнікі пагражалі збіць да смерці, калі затрыманыя націскалі на кнопку выкліку ў камеры. Адзін чалавек папрасіў таблетку ад ціску.

> *“Сказалі: ‘Якога хера ты без таблетак тут знаходзішся?‘ У нашай сітуацыі, у нашай краіне ты павінен таблеткі заўжды насіць з сабой, таму што ты не павінен ведаць, калі цябе забяруць. Гэта можа адбывацца заўжды і паўсюль”.*

У камеры аднаго з апытаных, на другім паверсе, быў мужчына са зламанай нагой. Яго сукамернікі пачалі стукаць у дзверы з просьбай выклікаць лекара, але сілавік ім адмовіў у вельмі грубай форме — матам, загадвалі маўчаць, *“а то вы ўсе здохнеце”*. У нейкі момант мужчыны, губляючы прытомнасць, пачалі стукаць у дзверы — прасіць пра дапамогу.

> *“Адчыніліся дзверы, дзе стаялі 3 супрацоўнікаў АМАПа, што было бачна па іх абмундзіроўцы, з балаклавай на галаве, якія сказалі, што прыйшоў карны атрад, што я павінен выйсці, і што мне ‘піздзец’. Я выйшаў і спачатку стаяў, пакуль мяне збівалі дубінкамі. Я не крычаў, і яны загадалі мне сесці тварам у падлогу, рукі за спіну, пасля чаго мяне сталі збіваць дубінкамі па спіне, я спрабаваў прыкрыць ныркі. Пасля апошняга ўдару па твары, у мяне пайшла кроў з носу, яны працягнулі мяне збіваць дубінкамі”.*

Бліжэй да абеду затрыманых пачалі выводзіць з камераў для здымкі на відэакамеру. Яны павінны былі назваць сваё прозвішча і імя, адрас пражывання.

З 19:00 да 20:00 збіцця затрыманых узнавіліся, яны нема крычалі.

Усю ноч людзі не маглі спаць, паколькі ім не выключалі святло. А таксама ўсю ноч яны чулі гукі машынаў, якія прыбываюць, гучныя крыкі, гукі збіцця і жахлівыя стогны.

# 11 жніўня 2020 года

Затрыманых у горадзе працягвалі прывозіць на Акрэсціна.

У ноч з 10 на 11 жніўня ў двары ЦІП працягвалася збіццё затрыманых. За вечар на тэрыторыю прыбылі два — тры дзясяткі аўтазакаў. Машыны ішлі чарадой, сілавікі ў двары ЦІП паказальна лютавалі і літаральна раўлі ад злосці, збіваючы дубінкамі людзей, якія выходзілі з аўтазакаў.

Працэдура "прыёму" тых, хто паступаў, выглядала наступным чынам. Людзі праходзілі "калідор" са збіццём, потым іх ставілі на калені тварам да плота, рукі ў іх знаходзіліся за спінай, а лоб упіраўся ў зямлю. Пры гэтым не спыняліся ўдары дубінкамі, крыкі, мат і абразы.

Людзі, якія былі затрыманыя раней і ўжо знаходзіліся ў камерах, былі зусім дэзарыентаваныя ў часе. Аднак кожны дзень па вечарах, прыблізна з 22:00, яны чулі адны і тыя ж гукі, калі прыязджалі аўтазакі з новымі затрыманымі. Навапрыбылых збівалі, былі чутныя іх крыкі і стогны, потым іх заганялі ў камеры ў прагулачным дворыку ці ў камеры ў памяшканні ЦІП.

## 00:00 — 07:00

### Двор ЦІП

11 жніўня збіццё затрыманых працягвалася. Усё праходзіла па той жа схеме. Уначы, пры выгрузцы з аўтазака, пацярпелых праганялі праз "калідор": сілавікі выбудоўваліся ў два шэрагі адны насупраць іншых і наносілі ўдары затрыманым, якія прабягалі між іх. Потым людзей змяшчалі ва ўнутраны двор — асфальтаваную пляцоўку на вуліцы, дзе яны знаходзіліся па некалькі гадзінаў, стоячы на каленях з апушчанай уніз галавой. Уначы стала вельмі халодна і людзі замярзалі. У часткі з іх была парваная вопратка, а ў некаторых нават не было абутку на нагах.

> *"Ва ўнутраным дворыку нас паставілі да сценкі на калені, рукі на сцяну і галавой уніз. У каго зацякалі канцавіны, хто спрабаваў неяк варушыцца або задаваць пытанні — жорстка збівалі".*

Да тых, хто стаяў ля сцяны на каленях, падыходзіла супрацоўніца ЦІП у суправаджэнні сілавікоў і запісвала на паперу дадзеныя: прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння і месца працы. Пры гэтым падымаць галаву і глядзець на іх не дазвалялася. Супрацоўніца прыніжала людзей, калі хтосьці паварочваў галаву — яго білі.

> *"Хадзіла жанчына, каго за валасы, каго за майку падымала, пыталася прозвішча, імя, дату нараджэння. З ёй хадзілі два супрацоўнікі міліцыі, амапаўцаў там не было. Яны хадзілі без масак, без балаклаваў, але паглядзець [на іх] асабліва нельга было, таму што калі падымеш галаву, то потым моцна пакараюць".*

> *"Іншая дзяўчына падыходзіла ўжо са складу Акрэсціна. Яна падышла да чарговага пытацца ПІБ і адрас, і чалавек ёй пачаў адказваць. На што яна яму ў грубай форме: 'Хуй з роту дастань і скажы нармальна'".*

Нягледзячы на тое, што разглядаць сілавікоў было вельмі небяспечна, некаторыя пацярпелыя змаглі запомніць і ў далейшым апазнаць сваіх катаў. Многім за асаблівы садызм запомніўся Жэня[11], жорсткасць якога палохала нават яго калегаў-сілавікоў.

> *"Ва ўнутраным дворыку нас асабіста біў такі ***, які называецца Жэня. Ён біў*

11. Па сведчаннях затрыманых, гэта супрацоўнік ЦІП Яўген Урублеўскі.
Пра супрацьзаконныя дзеянні Я.Урублеўскага сведчаць многія грамадзяне, якія адбывалі ў розны час адміністратыўны арышт у ЦІП. https://spring96.org/be/news/107040

*мяне і казаў: 'Што, вам падабаецца, блядзь, кідаць living кактэйлі Молатава?'. Я нічога не кідаў, я ўсміхнуўся. Ён збіваў усіх, хто быў там, біў людзей, якія былі з акулярамі: 'Ну што, чатырохвокі, блядзь, я цябе зараз адпізжу!'. Мы стаялі на каленях, рукі за галаву, а гэты Жэня пастаянна нас біў. А астатнія два чалавекі, якія там былі, казалі: 'Жэня, супакойся, перастань рабіць гэта'. А ён працягваў".*

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

Пасля знаходжання ва ўнутраным двары ЦІП затрыманых заганялі ў перапоўненыя прагулачныя дворыкі або разводзілі па камерах. Перад гэтым іх распраналі і абшуквалі. Некаторым давялося знаходзіцца ў прагулачных дворыках да раніцы. Уначы было вельмі халодна, праз краты задзьмуваў халодны вецер. Усе затрыманыя былі ў лёгкай вопратцы і ім даводзілася прыціскацца адно да аднаго, каб хоць крыху сагрэцца. У такой позе яны стаялі 5-6 гадзінаў, пры гэтым за кожны рух іх палівалі халоднай вадой. Ахоўнікі пастаянна пагражалі, смяяліся з затрыманых. Аднаму, моцна акрываўленаму, яны казалі: *"З такіх, як ты, падчас Другой Сусветнай вайны мыла рабілі"*.

*"Усе знаходзіліся ў стане жаху, усё ўспрымалася як нейкі канцлагер. Мы выразна чулі, як у суседнім дворыку збівалі людзей, асабліва старалася нейкая жанчына".*

*"Спалі ў кучах, таму што было вельмі халодна, па начах аблівалі халоднай вадой наглядчыкі. Пастаянныя крыкі, стогны з суседніх клетак. Некаторым пагражалі засунуць дубінку ў задніцу".*

У выніку некаторыя затрыманыя правялі ў прагулачным дворыку чацвёра сутак. Адсутнічалі якія-небудзь мінімальныя ўмовы для асабістай гігіены. Пацярпелыя распавядаюць, што за гэты час іх усяго двойчы выводзілі ў прыбіральню. У іншых дворыках увогуле не выводзілі, людзі былі вымушаныя спраўляць патрэбу прама там.

*"Уначы ў дворыку было вельмі халодна. Прыбіральні ў ім не было і затрыманыя дзяўчаты вымушаныя былі карыстацца нейкім люкам у падлозе, пры гэтым зверху за гэтым назіралі ахоўнікі-мужчыны".*

*"Гэта было прама дзіка, вельмі дзіка. Закідваюць туды хлопца. Ён прастаяў хвілінаў пятнаццаць, напэўна, па адчуваннях, і кажа: я выбачаюся, але я больш не магу. Здымае штаны, здымае трусы, пачынае трусамі выціраць фекаліі".*

Затрыманым не давалі ні вады, ні ежы. Калі яны папрасілі хлеба, укінулі адзін бохан. За 26 гадзінаў выдалі максімум пяць дзвюхлітровых бутэлек вады з-пад крану.

*"Стаялі, мерзлі, хтосьці спаў, хтосьці не спаў. Калі прасілі ежу, як скаціне кідалі ў камеру адзін бохан хлеба — гэта было ўначы 11 жніўня ў 3–4 гадзіны".*

## Камеры, калідоры ЦІП

Збіццё працягвалася і па дарозе ў камеры: пацярпелыя беглі па лесвіцах у ніжняй бялізне і атрымлівалі ўдары дубінкамі ад сілавікоў, якія стаялі па абодва бакі ад іх. Распранутыя затрыманыя з пакетамі ў руках апынуліся ў камерах.

У невялікіх памяшканнях, разлічаных на пяць — шэсць чалавек, утрымлівалася па некалькі дзясяткаў. Хтосьці мог сядзець, хтосьці стаяў, але ўсе адначасова сесці ці легчы яны не маглі. У камерах была халодная бетонная падлога. Людзі прыстасоўваліся да ўмоваў, як маглі: здымалі красоўкі і сядалі на іх, а на вынятыя ўсцілкі ставілі ногі. Некаторы час так можна было пасядзець. Спаць даводзілася на падлозе, і пад ложкамі, на ложках спалі па чарзе.

У перапоўненых камерах не хапала паветра, людзі прасілі адчыніць хаця б адтуліну-"кармушку",

але сілавікі не рэагавалі на іх просьбы. Замест гэтага яны вылівалі ў камеру вёдры вады і збівалі тых, хто звярнуўся. Многія з апытаных кажуць пра тое, што стараліся не націскаць на кнопку выкліку персанала, таму што за гэта маглі збіць усю камеру. Да таго ж людзей і без усялякай прычыны выводзілі па адным і збівалі.

> *"Адзін раз я чуў, як жанчыну нейкую выводзяць з камеры, па голасе ўжо ва ўзросце такую. Не ведаю чаму, але тады я быў упэўнены, што яе здымаюць на камеру, і ёй кажуць: 'Вось ты была з плакатам 'Не фашызму'. Што такое фашызм?'. Яна кажа: 'Ну вось тое, што вы робіце'. А яны ёй: "Не! Тое, што мы робім, называецца садызм'. Ну і прылятае дубінкай ёй".*

> *"Часта кагосьці ўначы аднаго з камеры выводзілі, з суседніх камераў на калідор. Збівалі і вярталі. І калі застаюцца сляды крыві на падлозе, ты сваёй майкай павінен гэта выцерці, а майку потым памыць так, каб яны не змаглі прыдрацца".*

У камерах знаходзіліся людзі з рознымі хранічнымі захворваннямі: цукровым дыябетам, эпілепсіяй, хваробамі сэрца. Нават падчас вострых прыступаў хваробаў медыцынская дапамога затрыманым у большасці выпадкаў не надавалася, просьбы пра медыцынскую дапамогу сілавікі ігнаравалі.

> *"У камеры быў чалавек з эпілепсіяй, у яго адбыўся прыпадак — ён упаў на падлогу, пачаў торгацца, пацякла пена з роту. Хтосьці крыкнуў, каб трымалі яму галаву, пачалі біць у дзверы, клікаць лекара. Прыйшоў супрацоўнік 'Хуткай дапамогі' і сказаў, што гэта пройдзе. Праз гадзіну ў мужчыны зноў здарыўся прыпадак, прыйшоў той жа 'лекар', паглядзеў на яго: 'Не праходзіць? Ладна, нясіце!'. І чацвёра затрыманых хлапцоў вынеслі яго і паклалі ў калідор. Што з ім было далей, невядома".*

> *"Затрыманыя пачалі стукаць у дзверы, крычаць: 'Лекара паклічце!'. Прыйшла медсястра, якая збівала, калі да яе звярталіся па дапамогу (бландзінка з карэ). Яна яго вывела на калідор, дала нашатыр панюхаць, ударыла яго па твары са словамі: 'На мітынг змог хадзіць, вось і зараз змажы пастаяць'. Яна памяняла яму павязку і адправіла назад…".*

> *"Ён прасіў фельдшара выклікаць хуткую дапамогу. На што яна яму адказала: 'Я магу табе толькі катафалк выклікаць у морг'".*

Уначы затрыманыя чулі ўдары дубінак, нечалавечыя крыкі і стогны, якія працягваліся прыблізна да світанку. Толькі пасля 03:00–04:00 збіццё і крыкі пачыналі паступова сціхаць.

> *"Самае жорсткае — гэта калі я прачнуўся ў гадзіну ночы ад крыкаў людзей. Мужчынаў білі так моцна дубінкамі, што было чуваць хруст костак, крыкі былі такія моцныя, што людзей быццам бы палілі. Дарослыя мужыкі крычалі: 'Мама! Дапамажыце! Ратуйце!'".*

Адна з затрыманых распавяла, што ўтрымлівалася ў камеры з вакном, якое выходзіла на браму, куды заязджаюць аўтазакі. Пацярпелая падлічыла, што кожную ноч прыязджала па 7–8 аўтазакаў. Яна і сукамерніцы бачылі, як паступалі ўсё новыя і новыя затрыманыя. Жанчыны чулі, як іх збівалі, як яны крычалі, як босых мужчынаў ганялі па калідоры. Пацярпелая распавяла, што ў некаторых жанчынаў, асабліва ў якіх затрымалі сына, мужа ці брата, здараліся прыступы істэрыкі. З успамінаў жанчыны:

> *"І я памятаю, што ў многіх у камеры псіхіка здавала ў гэтыя моманты. Я памятаю, там была жанчына з дзвюма дочкамі і яна проста пачала крычаць у нейкі момант. Затыкнула вушы і пачала крычаць, падвываць ад жаху, што адбываецца. Хтосьці проста плакаў".*

## 07:00 — 24:00

Пад раніцу масавае збіццё ў камерах спынілася. Затрыманых працягвалі выводзіць цэлымі камерамі на калідоры, дзе пад ціскам сілавікоў, не чытаючы, яны падпісвалі неабходныя дакументы. Зранку пачаліся суды, якія праходзілі прама ў будынку ЦІП, на чацвёртым паверсе. Многія затрыманыя, якія заставаліся пасля ночы ў двары, ляжалі ці стаялі ў нязручнай позе ўвесь дзень у чаканні суда ці пераводу ў камеры.

Удзень людзей ужо не білі мэтанакіравана, аднак перыядычна можна было атрымаць удар ад сілавіка. Часцей за ўсё гэта здаралася, калі хтосьці з затрыманых звяртаўся да іх з просьбамі — прынесці вады, звадзіць у прыбіральню, надаць медыцынскую дапамогу ці проста пра магчымасць размяцца, паколькі ў многіх ад доўгага знаходжання ў нязручнай статычнай позе зацякала цела.

## Двор ЦІП

Людзей працягвалі прывозіць у ЦІП. Калідора з сілавікоў удзень не было. У двары гарэла яркае святло. Стаялі двое сілавікоў у чорнай экіпіроўцы: адзін калі аўтазака, другі каля сцяны. Затрыманым трэба было вельмі хутка прабегчыся ад аўтазака да сцяны, і першы збіваў людзей, якія выходзяць з машыны, дубінкай.

> *“Мы ляжалі тварам, гэта было становішча на каленях, тварам у зямлю, рукі за спіну і галавой утыкнуўшыся ў зямлю, ногі пад сябе. Быў грубы голас аднаго камандзіра, калі шчыра, то я мяркую, што гэта быў Балаба, таму што ён усім камандаваў”.*

Далей затрыманых адводзілі ў памяшканне, дзе рэгістравалі і апісвалі вынятыя рэчы. Там ім загадалі пастроіцца, зняць пярсцёнкі, дастаць шнуркі і распрануцца дагала. Сілавікі абрэзалі завязкі з баек затрыманых і абшуквалі кішэні.

Пасля агляду пад гучныя крыкі і нецэнзурную лаянку людзей зноў збівалі. Як расказалі пацярпелыя, сілавікі былі ўпэўненыя, што людзі прыйшлі на мітынгі, таму што ім за гэта добра заплацілі. Нястрымна збіваючы затрыманых, яны не перастаючы крычалі пра гэта.

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

У прагулачных дворыках катаванні затрыманых працягваліся. Сілавікі праводзілі “прафілактыку” — білі іх дубінкамі са словамі: *“Што? Будзеце працягваць?”*. Затрыманыя дружна адказвалі: *“Не, вядома”.* Аднак усё адно атрымлівалі ўдары дубінкамі.

Уначы моцна пахаладала. Пацярпелыя мерзлі і таму шчыльна прыціскаліся адно да аднаго. Усе былі збітыя і з цяжкасцю трымаліся на нагах. Ежы не давалі. Ваду прыносілі з прыбіральні ў пластыкавых бутэльках у абмежаванай колькасці — прыкладна 2–3 бутэлькі на 50 чалавек у суткі. Гэтыя бутэлькі выкарыстоўвалі таксама для таго, каб схадзіць па малой патрэбе, паколькі ў дворыках не былі прадугледжаныя прыбіральні. Бутэлек не хапала, і некаторым людзям даводзілася спраўляць патрэбу прама ў дворыку. Калі хтосьці прасіў ежу, звязацца з роднымі ці з адвакатам — за гэта трапляў пад збіццё.

Прыкладна ў шэсць-сем гадзінаў раніцы 11 жніўня затрыманыя пачулі, як на другім паверсе людзі з камераў пачалі стукаць у дзверы і крычаць *“Выпускай!”*. Па словах апытаных, ужо праз 15 хвілінаў гэтых людзей вывелі ў калідор паміж двума прагулачнымі дворыкамі і жорстка збілі:

> *“Спачатку дыялог быў: ‘Хто высоўвае патрабаванні наконт ежы, званка і адваката?’. Пад гэтыя словы яны проста пачалі іх збіваць, яны вельмі доўга іх збівалі, людзі крычалі, стагналі. Гэта за сцяной было літаральна, мы гэта*

*ўсё чулі".*

Некаторыя пацярпелыя знаходзіліся ў стрэсавым стане, ад шоку яны не разумелі, што з імі адбываецца. Пацярпелым не надавалася медыцынская дапамога.

*"Гаворыш з чалавекам, а ён такі: 'Гэта вы мяне так? За што, хлопцы вы мяне так збілі? А дзе жонка мая?'"*

*"У аднаго хлопца была скальпаваная галава, адзін з амапаўцаў зрэзаў яму валасы разам са скурай на цемечку. Адтуль струменілася кроў, свежая рана была. Прасілі меддапамогу, паколькі многім было дрэнна".*

## Камеры, калідоры ЦІП

Зранку зноў пачалі выводзіць на суды, якія адбываліся ў будынку ЦІП. Затрыманым, як і раней, абяцалі, што калі яны падпішуць пратаколы, то ім дадуць толькі штраф і яны адразу ж пойдуць дадому. Многія верылі і згаджаліся на гэта. Аднак практычна ўсе атрымлівалі суткі адміністратыўнага арышту.

Суд выглядаў наступным чынам. Затрыманых прыводзілі ў кабінет, дзе знаходзіліся суддзя і сакратар. Суддзя зачытвала пратакол і матэрыялы справы, высвятляла пазіцыю затрыманых. Адстаяць свае правы ў судзе было немагчыма. Суды ніяк не рэагавалі на заявы пра катаванні, жорсткае абыходжанне, факты псіхалагічнага гвалту, а таксама парушэнні працэсуальных правоў. У хадайніцтвах пра наданне абаронцы адмаўлялі, матывуючы гэта адсутнасцю ў затрыманага дамовы з адвакатам. Адна з пацярпелых распавядала, што заявіла хадайніцтва пра спыненне катаванняў у дачыненні да яе і іншых затрыманых, на што суддзя Мотыль адказала: *"Я толькі суддзя. Гэта не мая кампетэнцыя. Са скаргамі на ўтрыманне звяртайцеся да начальніка ЦІП".*

Пацярпелая падрабязна распавяла суду пра тое, хто і пры якіх абставінах прымяняў да яе катаванні. Суддзя задала толькі некалькі фармальных пытанняў і ніяк не адрэагавала на гэтую заяву.

***Пацярпелая:*** *"Мяне білі галавой аб сцяну пастаянна, спрабавалі парваць пахвінныя звязкі, выкручвалі рукі за адмову падпісаць пратакол, з якім я нават не была азнаёмленая".*

***Суддзя Мотыль***: *"Прозвішчы супрацоўнікаў, якія гэта рабілі?"*

***Пацярпелая:*** *"Ведаеце, яны калі білі, адмовіліся прадстаўляцца".*

***Суддзя Мотыль***: *"А апазнаць зможаце?"*

***Пацярпелая:*** *"Вядома, змагу. Вось яна, якая побач стаіць, і мяне прывяла. Менавіта яна і біла, і яшчэ адзін з шырокімі цёмнымі бровамі".*

Пасля суда людзей вярталі ў душныя перапоўненыя камеры. У камерах стварaліся чэргі да вакна, каб крыху пасядзець там падыхаць.

З вокнаў некаторых камер было бачна тое, што адбывалася ў двары — там жорстка збівалі затрыманых. Некалькі апытаных згадваюць выпадак, які бачылі з вокнаў камераў трэцяга паверха:

*"Я памятаю такі момант: чалавека б'юць прама жорстка, і ён, як сабака, зачынены дзесьці, шкрабецца і крычыць: 'Калі ласка, не трэба!' Ён там маліў.*

*Я памятаю, што ў іншым канцы гэтага двара хтосьці, разумеючы, што з ім будзе, крыкнуў 'Жыве Беларусь!'. І ўвесь гэты статак пабег шукаць, хто крычаў. Білі там увесь вугал".*

Людзі, якія сядзелі ўначы ў камерах, не вытрымлівалі і, гледзячы на гэтае жорсткае збіццё, крычалі *"Фашысты! Сволачы! Што вы робіце?"*. У камеры забягалі сілавікі і моцна збівалі іх. У нейкія камеры вылівалі вёдры вады з хлоркай.

У камерах знаходзіліся затрыманыя з інваліднасцю, з рознымі захворваннямі, у тым ліку, псіхічнага характару. У кантэксце таго, што адбывалася, гэтыя людзі асабліва мелі патрэбу ў медыцынскай дапамозе, але сілавікі не звярталі на іх стан ніякай увагі.

> *"У адной з жанчын была вельмі моцная мігрэнь. Паколькі святло [у камеры] ніколі не выключалі, ёй даводзілася сядзець галавой у тумбачцы".*

# 12 жніўня 2020 года

## 00:00 — 07:00

### Двор ЦІП

Уначы з інтэрвалам у 30–40 хвілінаў у ЦІП прывозілі ўсё новых людзей. Кагосьці расстаўлялі ля сцяны, камусьці загадвалі апускацца на калені, каб ягадзіцы ляжалі на пятках, галава ўпіралася ў зямлю, рукі былі за спінай або за галавой. Поза вельмі хваравітая, паколькі дранцвеюць усе часткі цела, а знаходзіцца ў гэтай позе прымушалі вялікую колькасць гадзінаў. Было вельмі халодна, але прыціскацца адно да аднаго не было магчымасці.

Супрацоўнікі падыходзілі і пыталіся ў кожнага затрыманага асабістыя дадзеныя, трэба было выкрыкваць імя і прозвішча, год нараджэння. Калі хтосьці крычаў недастаткова гучна, яго збівалі. Пры гэтым абшуквалі, дастаючы ўсё з кішэняў (пасля высветлілася, што ў многіх затрыманых скралі грошы). Медыцынская дапамога не надавалася, у прыбіральню не вадзілі, ваду не давалі, абражалі, збівалі. Некаторыя былі збітыя так, што не маглі хадзіць, яны ляжалі на зямлі, іх целы ўжо не рэагавалі на збіццё. З тых, хто не мог хадзіць, супрацоўнікі смяяліся і здзекаваліся. Пастаянна пыталіся: *"Хто заплаціў? Дзе 50 еўра?"*

> *"Пры мне пабілі глуханямога, таму што ён не мог адказваць на пытанні".*

Бесперапынна прывозілі новыя партыі затрыманых. Іх білі ў адным з дворыкаў. У тую ноч асабліва моцна збівалі пазначаных фарбай і байкераў. Знутры Акрэсціна некаторых затрыманых таксама пазначалі маркерам, у тым ліку і тых, хто гаварыў на беларускай мове.

> *"Гэта былі жудасныя крыкі, гэта было штосьці няўяўнае. Была нейкая жэсць, як быццам там косткі ў іх трашчалі, крыкі як быццам з пякельні. У кагосьці былі татуіроўкі з бчб і Пагоняй, быў загад іх біць мацней. Хтосьці з пацярпелых крычаў: 'Я люблю АМАП', іх пры гэтым білі палкамі.*

Пасля ўсіх заводзілі ў будынак ЦІП і прымушалі распранууцца цалкам. Усе працэсы суправаджаліся збіццём. Пацярпелыя сведчаць пра некалькі моцна збітых, якія адхарквалі крывёю.

> *"Адзін хлопец, якога білі, відаць, ужо адчаяўся моцна і пачаў крычаць: 'Ганьба! Ганьба! Ганьба!'. Ён ужо зразумеў, што ўсё адно яго б'юць, дык няхай хоць лепш захаваць гонар, годнасць. Гэта апрыёры значыла, што яго будуць біць яшчэ больш. І ён свядома ішоў на большыя калецтвы. Такое робяць або ад вялікай сілы волі, або ад адчаю".*

У гэтую ноч некаторых дзяўчат таксама збівалі. Асабліва жорстка білі дзяўчыну, якая была байкеркай.

Бліжэй да шасці гадзінаў раніцы частку затрыманых пагналі ў падвал ЦІП. Таго, хто не мог бегчы і падаў, збівалі дубінкамі. Пры гэтым іншых затрыманых (каля 15–20 чалавек), якія былі дастаўленыя ў ЦІП раней і ўтрымліваліся ў камерах, вывелі ў двор, загадалі легчы на зямлю і пачалі збіваць дубінкамі па нагах, пасля чаго ля сцяны іх жа прымусілі прысесці 50 разоў. Тых, хто па меркаванні супрацоўнікаў дрэнна гэта рабіў, яшчэ мацней білі па нагах.

> *"І такі гук удара, быццам б'юць па пластыку, па машыне. Чуеш, як гэты амапавец прама крахціць, задыхаецца, фізічна ўжо стаміўся ад таго, што ён б'е. І ён прама крычыць, быццам рыхтуецца да гэтага ўдара, і ўсю сваю сілу, якую можа ўкласці, укладвае. І б'е ён аднаго чалавека. І б'е ён не адзін. Гэта было проста страшна.*

Калі сілавікі стамляліся, яны мяняліся, і збіццё пачыналася з новай сілай. Усё гэта працягвалася да раніцы.

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

Па сведчаннях затрыманых, у адным з прагулачных дворыкаў знаходзілася 176 чалавек[12]. Прыбіральняў у іх не было. Людзей заводзілі туды і прымушалі стаць на калені, галавой у падлогу і рукі назад. Рукі былі перацягнутыя сцяжкамі. Калі хтосьці з сілавікоў заўважаў, што ў затрыманага развязаліся сцяжкі, ён пачынаў крычаць і збіваць гэтага чалавека. Стаялі ў некалькі шэрагаў, цалкам голыя, галавой упёршыся ў падлогу ўшчыльную “да чыіхсьці ягадзіцаў”. Гэта было непраўдападобнае прыніжэнне. Вось што пра гэта кажа адна з затрыманых жанчынаў:

> *“Калі [мяне] вялі, бачыла, як у суседняй прагулачнай камеры напаўаголеных і голых мужчынаў, якія ляжалі на падлозе, збівалі дубінкамі. На сценах і падлозе была кроў”.*

Адзін з затрыманых у пяць гадзінаў раніцы папрасіў вады, ахоўнікі пасмяяліся, а праз пару хвілінаў прынеслі два вядры халоднай вады і вылілі яе на мужчынаў. Ноч была халодная, людзі стаялі голыя на бетоннай падлозе пад адкрытым небам, прыціскаючыся адно да аднаго, каб хоць неяк сагрэцца. Ваду давалі рэдка і столькі, што яе ледзь хапала па глытку на кожнага. Знаходзячыся ў дворыку, затрыманыя добра чулі, як збівалі іншых.

## Калідор ЦІП, камеры

Калідор ЦІП сілавікі называлі “калідорам ганьбы”. Калі затрыманыя беглі па ім, яны дубінкай паказвалі, куды бегчы. Трэба было здагадацца, куды бегчы, па ўдары дубінкі, пры гэтым падымаць галаву забаранялася. Некаторыя збітыя кульгалі на адной назе, было цёмна і зусім незразумела, у які бок рухацца. На падлозе была плітка і па ёй цягнуўся крывавы след, па ім можна было арыентавацца, куды бегчы.

У калідоры затрыманых у чарговы раз прымушалі стаць на калені, галавой у падлогу, рукі зацягвалі жгутамі за спінай так, што праз пяць хвілінаў яны ўва ўсіх станавіліся фіялетавымі. Потым ім развязвалі жгуты і прымушалі распранацца дагала ў той жа позе.

У гэтых дзеяннях удзельнічала жанчына-супрацоўніца, якая наносіла некаторым затрыманым мужчынам удары ў вобласць пахвіны. Адзін з сілавікоў падыходзіў да затрыманых і вадзіў каля анусу дубінкай.

Рэчы складвалі ў мяшок і па камандзе, максімальна нізка апусціўшы галовы, затрыманыя беглі прама па калідоры да камераў.

У аднаго мужчыны, гадоў 50-ці, падчас гэтага працэсу здарыўся сардэчны прыступ, ён пабялеў і пачаў спаўзаць па сцяне ўніз. У аднаго з затрыманых вісела адарванае павека.

> *“Прыйшла лекарка… зрабілі ўкол у сэрца, хаця такія ўколы не заўжды рабіць можна. Мы чулі, як страшна гэты мужчына тады крычаў. Лекарка яму сказала: ‘Ты што, сука, таксама хочаш праз бальніцу адсюль з’ехаць?’ І яго адправілі ў камеру”.*

Усе камеры былі вельмі перапоўненыя. Там знаходзіліся людзі з рознымі цяжкімі калецтвамі. Хтосьці спаў, хтосьці сядзеў каля дзвярэй, хтосьці ўмудраўся спаць на тумбачцы. Вада была толькі ў кране, людзей не кармілі, пастаянна гарэла святло і даносіліся крыкі людзей, якіх збіваюць на вуліцы.

---

12. З паказанняў пацярпелых колькасць затрыманых у адным дворыку вар'іруецца ад 45 да 176 чалавек. Такіх дворыкаў у ЦІП было некалькі.

## 07:00 — 24:00

### Двор ЦІП

Раніцай 12 жніўня сілавікі збівалі новапрыбытых затрыманых меней, чым уначы. Людзей працягвалі прывозіць з розных РАУС Мінска, кагосьці адразу адводзілі на суды, а хтосьці чакаў сваёй чаргі ў двары ЦІП.

Прывезлі аднаго хлопца з белым бранзалетам, якога сілавікі называлі “каардынатарам”. Яго паклалі на траву і пачалі збіваць без перапынку. Білі па спіне, па нагах, па хвастцу, па ягадзіцах. Абзывалі пацярпелага нацыстам. Потым прымушалі крычаць: *“Жыве Беларусь!”, “Я люблю АМАП”*. Збівалі яго доўга і жорстка. У нейкі момант хлопец сказаў, што не любіць “псоў рэжыму”. Пасля гэтага сілавікі пачалі збіваць яго яшчэ мацней, пакуль ён не страціў прытомнасць.

На вуліцы было дастаткова халодна, таму большасць з тых, хто знаходзіўся ў двары і быў лёгка апрануты, замярзалі. Пацярпелым працягвалі адмаўляць у медыцынскай дапамозе, таксама перыядычна пагражалі, абражалі і збівалі, не вадзілі ў прыбіральню, хтосьці хадзіў “пад сябе”. Людзі стаялі на каленях, упёршыся галавой у зямлю і трымаючы рукі за спінай. Дробныя камяні траўмавала калені і твар, і зямля, і людзі былі ў крыві.

> *“Вагу цела ўжо на галаву пераносіш, і ўжо стаіш, упіваешся ў гэтыя камяні галавой. Так мы прастаялі, напэўна, каля чатырох гадзінаў”.*

У такіх пакутлівых позах затрыманыя маглі правесці ад некалькіх гадзінаў да цэлага дня. Некалькі пацярпелых узгадваюць, як паміж шэрагамі затрыманых хадзіла жанчына-медык і пыталася ў сілавікоў, чаму так мала разбітых галоваў. Яна так нікога і не аглядзела, дапамогу нікому не надала.

Тых затрыманых, хто быў збіты да такой ступені, што не мог хадзіць, удзень забірала хуткая дапамога, але медыкі не маглі забраць усіх, каго хацелі. Сілавікі самі вырашалі, каго аддаць медыкам, а каго пакінуць. Некаторых збітых сілавікі выцягвалі проста з машынаў хуткай дапамогі, забараняючы забіраць у бальніцы.

> *“Ён [супрацоўнік] проста заходзіць у хуткую дапамогу, штосьці пытаецца ў лекараў, бярэ за шкірку і выкідвае з хуткай дапамогі са словамі: ‘Усё, халява скончылася’. Такім чынам, чатыры ці тры машыны хуткай дапамогі проста апынуліся пустымі. Нас не змаглі звезці”.*

Частку людзей пачалі звозіць у іншыя месцы ўтрымання: Жодзіна, Магілёў, Слуцк.

Некаторых затрыманых пачалі выпускаць, аднак перад гэтым супрацоўнікі АМАП зноў збівалі іх у двары ЦІП. Людзей ставілі на калені тварам у зямлю, потым рабілі “калідор”, білі 3–5 хвілінаў. Потым ім заламвалі рукі ззаду і вялі, а па сутнасці іх неслі, да плота, таму што ісці яны ўжо не маглі. Загадвалі на асфальце стаць нагамі на бардзюр з рукамі за спінай, а галавой уперціся ў плот. І ў такім стане трымалі доўга.

За сцяной ЦІП было чуваць галасы валанцёраў, і калі яны размаўлялі гучна, то затрыманых білі яшчэ мацней. Потым некаторых затрыманых пачалі выводзіць, але нічога не казалі пры гэтым, ніхто не разумеў, куды іх вядуць.

### Прагулачныя дворыкі ЦІП

У прагулачных дворыках людзі знаходзіліся ўвесь дзень 12 жніўня. Удзень там дазвалялі толькі стаяць, і пацярпелыя размаўлялі між сабой, каб хтосьці не заснуў ад стомы і не прысеў. За гэта маглі збіць усіх, хто там знаходзіўся. За ўвесь дзень выдалі 3–4 літры вады на 127 чалавек. На ча-

лавека было па адным глытку вады, але да дальніх шэрагаў вада не даходзіла ўвогуле.

На патрабаванні надаць медыцынскую дапамогу сілавікі не рэагавалі. У аднаго з мужчынаў здарылася дэфекацыя, да гэтага яго моцна збівалі. Некаторых хлопцаў проста выводзілі і збівалі. У многіх былі пераломы верхніх канцавінаў. Былі людзі з моцнымі пашкоджаннямі забрушынавай прасторы, нырак, з пераломамі рэбраў, з выбітымі зубамі.

> *“Потым людзі зразумелі, што мне вельмі дрэнна, мне рэальна патрэбная была медыцынская дапамога. Яны пачалі грукаць у дзверы. Падыходзіць нейкі наглядчык, глядзіць у вочка і штосьці кажа, што ‘гэтай псіне не належыць’... Потым прайшоў яшчэ нейкі час, мне ўжо стала зусім дрэнна. Усе людзі пачалі крычаць, што зараз чалавек, магчыма, памрэ. Пасля гэтага прыйшоў лекар, усе расступіліся. Лекар мяне агледзеў, зняў вопратку са спіны, зняў мне штаны, пасля гэтага я пачуў як людзі: ‘Вау, гэта тыпу ўвогуле жэсць’. Яны былі ўсе ў шоку... Лекар таксама быў у шоку”.*

Адзін затрыманы быў моцна збіты ў ЦІП, у яго пачаліся праблемы з сэрцам.

> *“Адзін хлопец скардзіўся на тое, што ў яго баліць сэрца... ён сказаў, што вось пасля таго, што было там 11 жніўня... ‘нас збівалі і ў мяне пачаўся гэты боль’. Лекар адразу зрабіў яму ЭКГ, убачыў праблемы вельмі моцныя. Ён... прымусіў зняць яго майку. Хлопец зняў...*
>
> *І гэты лекар настолькі сур’ёзна, калі ўбачыў тое, што ў хлопца ўсё ў сінякох. Ён: ‘Што вы робіце?! Вы да такога стану, вы так збівалі гэтага хлопца, ён жа малады, вы яго ледзь не забілі!’. Патрабаваў выклікаць старэйшага змены. Прыбег намеснік начальніка. Лекар сказаў, што складзе дакумент пра тое, што тут адбывалася, што яны ледзь не забілі чалавека. ... Лекар тэрмінова запрасіў шпіталізацыю на гэтага хлопца ў бальніцу... Стэлефанаваўся з бальніцай, каб рыхтавалі тэрмінова аддзяленне для хлопца... Пасля гэтага хлопца тэрмінова закінулі ў машыну хуткай дапамогі”.*

У іншым прагулачным дворыку сілавік ладзіў такую забаву: хто апошні апранаецца, таго збіваюць. Ён так і казаў: *“Хто апошні апранаецца, атрымлівае”*.

Удзень паставілі вядро, каб затрыманыя змаглі схадзіць у прыбіральню. Вядро імгненна перапоўнілася, паколькі ўсе цярпелі цэлую ноч. У выніку з вядра проста лілося, і да вечара трэць гэтага дворыка была ў лужыне мачы, а затрыманыя стаялі на тэрыторыі, якая засталася.

У адным з прагулачных дворыкаў знаходзіліся жанчыны. Прыбіральні там не было. Была адтуліна ў падлозе, і жанчыны хадзілі туды, прыкрываючы адна адну ад відэакамераў.

Калі пачало цямнець, частка затрыманых пачала патрабаваць, каб іх завялі ў камеры. Людзі непакоіліся, што другую ноч у прагулачным дворыку яны не перажывуць з-за начнога холаду. Пасля гэтага прыйшоў сілавік, загадаў пастроіцца ўсім ля сцяны, і пачалі разводзіць па камерах.

## Камеры, калідоры ЦІП

У калідорах працягвалі распранаць людзей, якіх выганялі з прагулачных дворыкаў. Падлога калідораў была ў крыві і мачы.

> *“У гэты момант яны мяне пачалі збіваць за тое, што я не магу ўстаць. Мяне сяк-так паставілі. Ногі дрыжалі, і я мог упасці. ...я не ведаю колькі там было чалавек, гэта называецца ‘калідор смерці’ ці ‘калідор катаванняў’... Яны сталі ў ‘калідор’... Мне трэба далей ісці... Яны мяне збівалі. Я не мог ісці, ззаду амапавец мяне ўдарыў па спіне вельмі жорстка. А я ў гэты момант яму сказаў: ‘Бі куды*

*заўгодна, але не бі ў спіну, таму што ў мяне дэфармацыя грудной клеткі прыроджаная, я магу стаць інвалідам і магу застацца тут ляжаць'.*

*Яны мяне паставілі на калені каля ўваходу ў прагулачны дворык… і пачалі збіваць па пятках… У гэты момант … кажа адзін з амапаўцаў: 'Крычы 'Я люблю АМАП''. Я пачынаю крычаць: 'Я люблю АМАП'. Ён кажа: 'Гучней!'. Я яшчэ гучней крычу… У гэты момант мяне яшчэ працягвалі біць па пятках… Пасля ён пачаў здымаць гэта на відэа на тэлефоне… і даслаў там камусьці, ці то жонцы, ці то яшчэ камусьці, ці то сябрам нейкім…"*

Людзей збівалі таксама нагамі. Калі хтосьці распранаўся марудна, яго білі. Распранацца было вельмі цяжка, таму што дранцвелі рукі і ногі. Не грэбавалі збіваць і жанчынаў. Перад тым як завесці ў камеры, адна з супрацоўніц ставіла кожную затрыманую ля сцяны і збівала.

Людзі траплялі ў перапоўненыя камеры. З паказанняў: *"у 4-х мясцовай камеры было 32 чалавекі", "у 5-мясцовай — 42 чалавекі", "у 4-мясцовай — 52 чалавекі", "у 5-мясцовай — 40 чалавек", "у 6-мясцовай — 33 чалавекі".*

У гэты ж дзень у некаторыя камеры прынеслі ежу (і некаторыя затрыманыя елі ўпершыню з моманту затрымання 9 жніўня, то бок праз трое сутак). Камусьці далі кашу незразумелага зместу, іншым у камеру далі адзін бохан хлеба на 25 чалавек.

Калі ў нейкай з камераў штосьці патрабавалі ад персаналу, дзверы адчыняліся і сілавікі вылівалі ў камеру, а па факце на людзей, вядро вады. У камеры і без гэтага было душна, а пасля таго, как вылівалі ваду, станавілася невыносна вільготна. На падлогу нельга было ні сесці, ні стаць.

У камерах многія людзі былі з пашкоджаннямі і траўмамі. У кагосьці былі зрэзаныя валасы са скурай, у кагосьці — зламаныя насы. Усе былі ў моцным стрэсе. Па словах апытаных, было адчуванне, што некаторыя затрыманыя вар'яцелі. У хлопца ў адной з камераў была істэрыка, ён быў моцна збіты, у яго была рассечаная галава, і ён думаў, што ўсе прысутныя хочуць яго забіць. Яшчэ аднаго хлопца перыядычна "закліньвала": нейкім чынам, седзячы на тумбачцы, ён засынаў, потым праз 30 хвілінаў прачынаўся і пачынаў казаць такія рэчы як "так, мне трэба схадзіць у басейн", "замовіць ежы сабе". Некаторыя жанчыны таксама "вар'яцелі" ад моцнага стрэсу.

*"Ногі затрыманых яна называла прыгожымі вазамі. Са словамі: 'Ну, усё, дзяўчаткі! Пакуль, я пайшла дадому'. Яна падышла да дзвярэй камеры, паторгала дзверы, пастукала, развярнулася і села на ложак назад. Яшчэ ўначы ў яе пачалася дыярэя. Яна пачала па затрыманых усіх хадзіць, быў адзін прыступ істэрыкі, але жанчыны пастараліся яго купіраваць, надаючы псіхалагічную дапамогу словамі падтрымкі".*

Былі жанчыны, якія гублялі прытомнасць. Адна з затрыманых, якой было 58 гадоў, была збітая супрацоўніцай за белую хустку.

*"'Сука, ты тут за Ціханоўскую, пачвара ты такая'. Яна яе біла, калі вяла".*

У некаторых камерах і прама ў калідорах удзень праходзілі суды. Кагосьці з затрыманых, калі вялі на суд, білі. Адзін з пацярпелых распавёў:

*"Вывелі на суд, уніз. Па-мойму, на другім паверсе праходзілі судовыя паседжанні… Мне не далі азнаёміцца з матэрыяламі справы, сказалі: 'Падпісвай'. Я кажу: 'Але я не згодны з тым, што там напісана'. І гэты [супрацоўнік] ззаду стаіць, дубінай у шыю: 'Падпісвай!' Пры суддзі ён: 'Закрый пашчу, падпісвай!'… У масцы, у балаклаве. Здаровы 'конь' у балаклаве, форма сіняя. Хто там быў — паняцця не маю… Калі я падпісаў дакументы, пачалося паседжанне. 'Віну прызнаеце?' Я кажу: 'Не прызнаю'. 'Чаму? Распавядзіце, як усё было'. Я ёй распавядаю. — 'Усё, вы вінаватыя. Чатырнаццаць сутак Вам'. Вось, уласна кажучы, і ўвесь суд".*

Пасля суда людзей здымалі на камеру. Іх апытвалі пра прычыны затрымання. Бліжэй да вечара людзей па трое сталі выводзіць на гутарку з супрацоўнікамі КДБ. Жанчын перад адпраўкай у Жодзіна супрацоўніца Крысціна абзывала шлюхамі, казала, што іх “пусцяць па коле”.

Затрыманых не кармілі трое сутак. Толькі 12 жніўня пасля абеду некаторыя затрыманыя атрымалі першую порцыю ежы (каша, хлеб і гарбата). 12 і 13 жніўня іх пакармілі адзін раз у дзень.

*“На трэція суткі нам кінулі бохан хлеба на 25-26 чалавек”.*

# 13 жніўня 2020 года

*"... адзін з хлопцаў з вельмі сур'ёзнымі траўмамі ног прасіў пра дапамогу: 'Калі ён папрасіў хуткую, яму сказалі: 'Хуткая ў цябе за спінай. Хочаш у хуткую — паўзі'".*

На працягу ўсяго дня адных затрыманых адвозілі ў іншыя ІЧУ, а новых дастаўлялі ў ЦІП.

Людзі, якія знаходзіліся пад адкрытым небам у двары ЦІП і ў прагулачных дворыках, замярзалі. Разам з гэтым працягвалася збіццё, прыніжэнні, запалохванні і абразы. Затрыманым працягвалі адмаўляць у медыцынскай дапамозе. Многія апытаныя распавядаюць пра тое, што сілавікі замінялі працаваць медыкам хуткай дапамогі і не дазвалялі забіраць нават цяжка параненых.

Камеры і прагулачныя дворыкі, як і раней, заставаліся перапоўненымі ў 6–7 разоў і больш (напрыклад, у 4-мясцовай камеры размяшчалі па 25–30 чалавек). Умовы ўтрымання вельмі жорсткія: па сценах сцякаў кандэнсат, дыхаць не было чым. Самаадчуванне ў многіх пацярпелых пагаршалася з-за голаду, адсутнасці сну, недахопу кіслароду і перажытага стрэсу. Ежа і пітная вада не даваліся ці даваліся ў вельмі абмежаванай колькасці. Людзей працягвалі катаваць дэпрывацыяй сну.

У ноч з 12 на 13 жніўня ў ЦІП прыехал на той момант намеснік міністра ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Аляксандр Барсукоў. Менавіта па яго загадзе, пасля таго, як ён пакінуў ЦІП, без якіх-небудзь законных працэдураў пачалі выпускаць затрыманых.

## 00:00 — 07:00

### Двор ЦІП

Гэтай ноччу пачалі вызваляць людзей. У двары ЦІП сілавікі спачатку прымушалі большасць затрыманых легчы на зямлю, а потым жорстка збівалі перад вызваленнем. Пры гэтым не хавалі, што робяць гэта з-за помсты за акцыі пратэсту і для таго, каб людзі ў будучыні не выходзілі на гэтыя акцыі. Пацярпелыя крычалі ад болю, але іх працягвалі збіваць яшчэ больш. Мацней за ўсіх збівалі людзей нестандартнай знешнасці: доўгавалосых, з дрэдамі, татуіроўкамі, пірсінгам, а таксама беларускамоўных. Жудасныя крыкі тых, каго збівалі, чулі валанцёры і родныя затрыманых за межамі тэрыторыі ЦІП і затрыманыя ў камерах ЦІП. Пасля збіцця людзей выпускалі, загадваючы бегчы, не спыняючыся і не азіраючыся.

*"Дзесьці ў пачатку пятай мяне вывелі ў дворык. Там была брамка, а за брамкай быў яшчэ адзін двор. І адтуль даносіліся стогны, лямант, крыкі. Гэта былі 'провады'.*

*Трэба было бегчы да сцяны. За кожным з нас быў замацаваны супрацоўнік АМАПа. Ён мне сказаў: 'Калі ўпадзеш, то табе будзе піздзец'. Трэба было ўстаць каля сцяны, падняць рукі ўверх і вывярнуць далоні, ногі на расцяжку. У гэты момант ён пачаў прабіваць мне нагамі ў вобласць ног у болевыя зоны. Збівалі доўга. Загадалі легчы на зямлю, рукі за спіну, у гэты момант збівалі дубінкай ад ягадзіц да ног. Трэба было ў гэты час спяваць гімн. Доўга збівалі, я цярпеў, маўчаў. Потым ужо ён пачаў мне падказваць словы. Я пачаў паўтараць за ім, удары былі не такія частыя. Потым трэба было ўстаць і бегчы ўздоўж плота ў адваротны бок. Там зноў быў калідор. Нас збівалі. Трэба было проста дабегчы да выхаду".*

*"Загадалі легчы тварам у зямлю. І, са словамі, 'такая прычоска зараз не модная' адрэзаў большую частку дрэдаў нажом. Потым сказалі далучыцца да асноўнай*

*групы. Ужо ўсе людзі стаялі ўздоўж сцяны, тварам да сцяны. І над кожным чалавекам стаіць амапавец. І ён пачынае біць дубінкай па бёдрах і ягадзіцах — гэта вельмі балюча. Я крычаў, стагнаў, ён штосьці крычаў мне ў адказ. Ён яшчэ мацней, наступае на цябе, трымае нагой".*

*"Усё, што я бачыла — сцены, агароджа белая, сцены будынка, паўсюль стаялі хлопцы. Па ўсім перыметры. Я не ведаю, колькі іх там было. Усё было запоўнена хлопцамі і іх выпускалі порцыямі і перад выпускам іх збівалі".*

*"Мяне першага паклалі на зямлю, сталі на ногі, адразу некалькі ўдараў па нагах, потым іншаму. Нас чалавек 20 ляжала. І давай лупіць па нагах. Калі ўсё закончылася, падняцца я ўжо практычна не мог — на мне 'добра' пастараліся. Я разумеў, што калі зараз не падымуся, мяне назад у камеру. Падняцца мне дапамог ваенны".*

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

Людзі, якія знаходзіліся ў тую ноч у прагулачных дворыках, фактычна на вуліцы, моцна замярзалі. У кожным дворыку ў той момант было ад 80 да 100 чалавек. Іх жорстка збівалі сілавікі. Зранку ім у дворыкі кінулі хлеб, кожнаму атрымалася прыблізна па 100 грамаў.

*"Потым загадалі апрануцца і вярнулі назад у гэты прагулачны дворык. Нас было 91 чалавек роўна. І там мы ўжо знаходзіліся каля 3 гадзінаў. Было вельмі халодна, паколькі было каля поўначы. Мы пачалі замярзаць і дзясяткі людзей, дзясяткі дарослых мужчынаў стоячы, ціснуліся адзін да аднаго, каб сагрэцца, дзяліліся вопраткай, таму што хтосьці нават быў без абутку, у шортах, у майцы. Адзін быў без майкі, то бок гэта было невыносна. Было настолькі шмат людзей на такі маленькі квадрат плошчы, што немагчыма было нават усім сесці на падлогу. То бок мы сядалі па чарзе. Так большы прамежак часу давялося стоячы, на холадзе быць там. Усю ноч мы чулі, як з двара даносіліся крыкі, людзей яўна збівалі, мучалі. У такім агульным стане мы прабылі да раніцы. Зранку адчыніліся дзверы, нам далі 6 батонаў, 6 боханаў хлеба на ўсіх".*

Затрыманыя сяк-так спрабавалі заснуць, але паспаць асабліва ні ў кога не атрымлівалася, не было месца на бетоннай падлозе. У адным з дворыкаў каля 80 чалавек да позняга вечара сядзелі цалкам голыя. У гэтых дворыках не было прыбіральняў, таму невялікія зліўныя адтуліны выкарыстоўваліся як прыбіральня. Пітной вады на ўсіх не хапала, паколькі сілавікі прыносілі не больш за дзве-тры паўтаралітровыя бутэлькі на дворык, дзе магло быць больш за сто чалавек.

Уначы прывозілі новых затрыманых. З іх псіхалагічна здзекаваліся і збівалі.

*"Чуваць, як збівалі людзей, чуваць было іх крыкі, сілавікі прымушалі крычаць 'Я люблю АМАП! Я люблю АМАП'. Людзі спявалі гімн Рэспублікі Беларусь. Было такое, што чуваць, яны спяваюць гімн, ім крычаць 'гучней, гучней', яны спяваюць яшчэ гучней, іх б'юць далей. Людзі ўжо на хрып сыходзяцца, а іх працягваюць біць. Я чуў душараздзіральныя крыкі, трэск электрашокераў, крыкі супрацоўнікаў. Адчуванне было, што туды выводзілі тупа збіць, паколькі пытанняў там не задавалі. Людзі крычалі 'Хопіць! Дапамажыце!' да таго часу, пакуль не змаўкалі".*

*"Калі ў камерах у кагосьці была верхняя вопратка, то яе клалі на падлогу, каб было цяплей ляжаць. Ад стомы хтосьці засынаў нават на халоднай бетоннай падлозе. У адной з такіх камераў каля 80 чалавек да позняга вечара сядзелі цалкам голымі".*

## Камеры, калідоры ЦІП

Некаторых затрыманых выводзілі з камераў у двор і збівалі. Людзі ў камерах чулі ўдары і жудасныя крыкі тых, каго збівалі. Многія сведчаць, што чуць гукі гэтых катаванняў было псіхалагічна невыносна.

*“Уначы 12 і 13 жніўня я добра чула, як з дворыка і з камеры даносіліся крыкі мужчынаў, якіх збівалі, яны прасілі дапамогу і клікалі сваіх маці. І кожны раз гэта працягвалася гадзіны па тры”.*

*“Я чуў, як уначы людзей выводзілі з камераў і збівалі ў двары турмы. Было чуваць гукі ўдараў і доўгія працяглыя крыкі. Хтосьці прасіў, маліў, апраўдваўся: ‘Гэта не я кідаў камяні’ і г. д.”.*

*“Знаходзячыся ў камеры, я чуў, як у аўтазаках прывозілі затрыманых і збівалі ў двары. Быў страшэнны вой”.*

Усе камеры былі перапоўненыя ў 5–6 разоў. Паветра не хапала, людзі ад спякоты гублялі прытомнасць. Медыцынскую дапамогу ім не надавалі.

*“У 3-мясцовай камеры нас было 17 (сямнаццаць) чалавек. Ні матрацаў, нічога няма”.*

*“З-за спякоты мужчыну ў камеры на трэцім паверсе стала дрэнна, таму яму выклікалі доктара, рэакцыя якога была: ‘Ну калі здохне, нічога страшнага. Помянем’”.*

У нейкі момант па камерах пачалі хадзіць сілавікі і казаць, што хутка прыедзе намеснік міністра МУС. Яны папярэджвалі не казаць нічога “лішняга”. У некаторых камерах, дзе знаходзіліся найбольш збітыя, пагасілі святло. Хутка ў ЦІП прыехаў Аляксандр Барсукоў. Перад яго прыходам з камераў выводзілі самых збітых, тым хто меў патрэбу давалі лекі. Барсукоў хадзіў па камерах з групай людзей, якія вялі здымкі, і абяцаў усіх вызваліць. Пасля яго наведвання ўначы затрыманых пачалі пакрыху вызваляць.

*“Літаральна праз 5 хвілінаў прыйшоў Барсукоў. Ён пачаў казаць, што ўсіх адпусцяць, што не ўсе супрацоўнікі дрэнныя, некаторыя ‘перагінаюць палку’. І спытаў: ‘Ці білі вас у камеры?’. Мы сказалі, што нас у камеры не білі, паколькі білі да камеры. У гэты момант жанчына здымала. Ён сказаў: ‘Усё, я вам абяцаю, што мы вас зараз адпусцім’. Усе заўсміхаліся. І ў гэты момант ён зноў адсунуўся і жанчына паздымала на відэа, што затрыманыя такія шчаслівыя і задаволеныя ў камеры”.*

*“Генералам гэтым быў Барсукоў. І ён такі заходзіць, разам з ім заходзяць нейкія жанчыны з відэакамерамі ўключанымі. Нам сказалі ўсім падрыхтавацца, лішняга нічога не казаць. Увогуле да таго, што ад таго, што вы будзеце казаць, будзе залежаць, вызваляць вас ці не”.*

*“Нам-та сказалі, што адпусцяць, ‘але [гэта] будзе залежаць ад таго, што вы скажаце. Таму думайце, хочаце вы адсюль сёння выйсці ці не хочаце’. Заходзячы ў камеру, Барсукоў задаваў пытанні: ‘Як, вас тут не б’юць?’. Хаця было відавочна, што б’юць — усе стаяць нават не сінія, а чорныя. Усе мы сказалі, што нас не б’юць. Сказаў, што вас адпусцяць, але каб больш не трапляліся”.*

*“Калі прыязджаў намеснік міністра МУС Барсукоў, нам не сказалі менавіта, хто гэта прыязджае. Сказалі, што зараз будуць хадзіць. Сказалі, што калі вы хочаце сысці адсюль жывымі, то ніхто нікога не біў. Хаця гэта нерэальна, таму што асабіста ў маёй камеры ніводнага чалавека цэлага не было. Усе*

*былі штосьці дзесьці неяк збітыя".*

## 07:00 — 24:00

## Двор ЦІП

Увесь дзень затрыманых з ЦІП развозілі па іншых ІЧУ. У той жа час сілавікі прывозілі новых. Медыцынскую дапамогу ім не надавалі, людзей з татуіроўкамі, дрэдамі, доўгімі валасамі, пірсінгам, беларускамоўных і, на думку сілавікоў, прыналежных да ЛГБТК супольнасці, узмоцнена збівалі. Усіх, каго этапавалі ў іншыя ІЧУ, да размеркавання па аўтазаках трымалі стоячы тварам да сцяны з паднятымі рукамі па 3-4 гадзіны. Тых, каго не этапавалі і хто не быў моцна збіты, пакрыху вызвалялі.

> *"Немалады тучный мужчына, які стаяў у натоўпе затрыманых, гледзячы па ўсім дыябетык, раптам пасінеў і рухнуў на зямлю. Усе пачалі клікаць дапамогу, і да ляжачага марудна, вальяжна падышоў медсупрацоўнік у чырвонай камізэльцы з крыжом, вялізны нягалены мужчына. Медсупрацоўнік не толькі нічым не дапамог мужчыну, ён нават не нахіліўся над ім, і, больш за тое, пнуў яго нагой, а потым прымусіў паўзці ў памяшканне".*

> *"І толькі варта табе неяк галаву павярнуць ці нейкі рух — адразу атрымліваеш дубінкай. Побач стаяў хлопец, у яго на руцэ татуіроўкі былі скандынаўскія руны. Падышоў, кажа: 'Ты што, фашыст? Што гэта такое? Ну-ка, пойдзем пагаворым'. Адвёў яго, некалькі разоў ударыў дубінай і назад паставіў. І да вельмі многіх чапляліся. 'Хто вам плаціць?', 'Чаго табе не жывецца, скаціна?', 'Я дома не быў ужо ведаеш колькі з-за такіх, як ты пачвараў?'".*

## Прагулачныя дворыкі ЦІП

Зранку ў прагулачныя дворыкі сілавікі пачалі кідаць людзям хлеб. Гэта было падобна на кармёжку жывёлаў: адчынялі дзверы і кідалі некалькі боханаў хлеба, пяць — восем, на 80 — 100 чалавек. Многія да таго часу не елі ўжо некалькі сутак. Таксама прыносілі вельмі абмежаваную колькасць вады, не ўсім хапала нават на глыток. Ваду прыносілі ў пластыкавых бутэльках ці чайніках, адкуль усе пілі з горлышка, што ў разгар COVID-19 было пагрозай здароўю і нават жыццю. Увечары пахаладала і людзі, якія знаходзіліся ў прагулачных дворыках, зноў змярзалі.

> *"Нам прынеслі ваду. Літры тры было максімум, чайнік металічны. Вады не хапіла, за ваду былі самыя ожесточенные спрэчкі. Канфлікты ўзнікалі менавіта з-за вады, што хтосьці зрабіў два глыткі, а павінен быў зрабіць адзін глыток. Піць вельмі хацелася. Я бачыў, хлопцы, якія былі збітыя, яны кажуць 'горла перасохла, я піць хачу'. За ўвесь час, мы лічылі, нам прынеслі 3 разы па 4,5 літры вады. Потым, праз некалькі гадзінаў, нам адчынілі дзверы і пачалі кідаць боханы чорнага хлеба. Мы палічылі, паглядзелі, колькі боханаў, палічылі, што адзін бохан на 6 чалавек павінен быў быць".*

> *"Каля 22 гадзінаў 13 жніўня да нас у камеру прыйшлі і сказалі, што выведуць на прагулку. Нас усіх вывелі на прагулку ў прагулачны дворык. Там ужо былі людзі. Як мы потым палічыліся, у прагулачным дворыку нас было 120 чалавек. У гэтым прагулачным дворыку мы знаходзіліся да 12 гадзінаў наступнага дня. З 22:00 да 12:00 гадзінаў, за гэты час нам далі 6 літраў вады, 3 бутэлькі па 2 літры. Усе пілі з бутэлек. Сярод нас быў малады чалавек, які быў проста ў ніжняй бялізне, на нагах у яго нічога не было. Пры гэтым падлога і сцены бетонныя, стократы. Яму хтосьці аддаў усцілкі з красовак, нейкую вопратку, паставілі ў*

*цэнтр. Змярзалі ўсе вельмі моцна".*

## Камеры, калідоры ЦІП

Зранку працягвалі судзіць затрыманых, адных па скайпе, іншых афлайн. Пры гэтым суддзі ігнаравалі скаргі пацярпелых на катаванні, не ўмешваліся, калі сілавікі білі людзей проста пры іх.

Карміць пачалі стабільней, аднак з-за перанаселенасці ЦІП да другога паверху ежа ўжо даходзіла ў абмежаванай колькасці, на ўсіх не хапала. Удзень у перапоўненых камерах было ўсё так жа душна. Некаторыя сілавікі, каб зрабіць людзям яшчэ больш пакутаў, мэтанакіравана зачынялі кармушкі ў дзверах, з-за чаго затрыманыя практычна задыхаліся без паветра. Невялікімі партыямі людзей працягвалі вызваляць.

*"Было вельмі горача. Вакно ў камеры ў нас было крыху прыадчыненае, была шчыліна. Дабрацца да вакна немагчыма, каб самому адчыніць (там краты), але яно ўжо было прыадчыненае. Усё адно, калі мы ўсе леглі, было вельмі горача, мы ўсе распрануліся да трусоў. У аднаго хлопца быў ціск (ён скардзіўся на ціск, казаў таблеткі п'е). Мы нікога не выклікалі. Нам распавядалі, хто націсне кнопачку выкліку, тую камеру абяцалі збіць. Таму, мы не націскалі гэтую кнопку".*

*"13 жніўня было ўжо тры прыёмы ежы. Як я пазней даведаўся ад таварыша, з якім мы ехалі ў аўтамабілі, яны былі вышэй, на трэцім ці чацвёртым паверсе. І да іх ежа проста не даходзіла, ім раздавалі проста хлеб".*

*"Суд праходзіў такім чынам: выклікалі 5–8 чалавек, падымалі іх на 2-гі паверх і хвілінаў праз 10–15 усе гэтыя людзі вярталіся ўжо, як правіла, 'з суткамі'. Пры гэтым усё гэта суправаджалася перад суддзямі збіццём проста ў іх перад вачыма".*

*"І ў нейкі момант мяне паклікалі ў кабінет, дзе сядзелі 2 жанчыны. Адна ў судзейскай мантыі, суддзя* ***Буйноўская А.І.****, суддзя суда Фрунзенскага раёна. Мне зачыталі, у чым я абвінавачваюся. Я патлумачыў, што нічога такога не было. Суддзі распавёў, як было, распавёў, што мяне збівалі, распавёў, што затрымалі ў іншым месцы, але суддзя гэта праігнаравала і сказала, што калі я не прызнаю сваю віну, то ніякіх паслабленняў быць не можа. У выніку мне прысудзілі 10 сутак арышту і адправілі ў іншы кабінет".*

## 14 жніўня 2020

Уначы і на працягу ўсяго дня 14 жніўня з ЦІП вызвалялі затрыманых. Як і ў папярэднія дні, пры вызваленні ў начны час сілавікі збівалі людзей. Удзень вызвалялі без збіцця, папярэджваючы, каб не выходзілі на акцыі пратэсту. Асабістыя рэчы людзям у пераважнай большасці не аддавалі, паколькі яны былі зваленыя ў адным пакоі і знайсці іх не было магчымасці. Многія вымушаныя былі пакідаць ЦІП без тэлефонаў, ключоў ад кватэры і сродкаў на праезд дадому.

### 00:00 — 07:00

Людзей працягвалі вызваляць. Перад вызваленнем АМАП збіваў іх нагамі і дубінкамі. Сілавікі здзекаваліся з людзей з дрэдамі, з доўгімі валасамі, татуіроўкамі.

*“Уначы пачалі прапаноўваць падпісаць згоду пра тое, што ты больш не будзеш удзельнічаць у мітынгах, у адваротным выпадку будзеш прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. У прынцыпе, усе падпісвалі, неахвочых не было, таму што і шанцаў не было: хто не падпісваў, таго білі, і яны ўсё адно падпісвалі. Пасля гэтага вывелі на вуліцу, пастроілі. Так мы стаялі гадзіны тры. Потым прыехалі амапаўцы, і зноў пачалі праводзіць дагляд. Пачалі аглядаць усіх, патрабавалі паказаць ягадзіцы і лапаткі, у каго не было траўмаў, клалі на зямлю і збівалі, у каго былі доўгія прычоскі — стрыглі проста пры нас, у двары. Выпускалі нас па 6 чалавек, са словамі, што, маўляў, зараз мы вас білі да паўсмерці, а ў наступны раз мы вас заб'ем”.*

*“Дзяўчынка адна ўвогуле адмовілася падпісваць паперу пра няўдзел у акцыях, сказала, што ў ‘мяне ключы там у маёй торбе, я нікуды не пайду, таму што мне ісці няма куды і гэтак далей. Аддавайце мне торбу’. Адзін амапавец пасля чаго ўзяў дубіну і пачалі яе там мяцеліць”.*

### 07:00 — 24:00

Працягвалася вызваленне затрыманых. Людзей, якія засталіся, рассялялі па іншых камерах. Перапоўненасць камераў ужо была не такая вялікая. Удзень пры вызваленні сілавікі людзей не збівалі. Многіх загружалі ў аўтазакі і вывозілі з тэрыторыі ЦІП у горад, дзе вызвалялі ў розных раёнах, падалей ад ізалятара. Пад сценамі ЦІП вызваленых сустракалі родныя і сябры, а таксама валанцёры, якія надавалі тым, хто меў патрэбу, медыцынскую і іншую неабходную дапамогу.

*“За гадзіну да вызвалення, прыкладна каля 13–14 гадзінаў, мы не ведалі, што яно будзе. Проста як гэта адбывалася: нас разгрузілі па камерах на другім паверсе па 5–6 чалавек, як быццам бы для выгляду, перад кімсьці. Потым выстаўляюць у калідор, мы па звычцы стаім тварам да сцяны. Прыходзіць мужчына і кажа: “Хлопцы, усё, цяпер вы вольныя. Можаце рукі трымаць па швах, паварочвайцеся тварам да мяне. І хачу перад вамі выбачыцца. Ува ўсіх сітуацыях канфліктных ляцяць шчэпкі, вы гэтымі шчэпкамі апынуліся. Мая задача проста вас прыехаць, пакарміць і выпусціць”.*

*У двары, пасадзілі ў аўтазакі, аўтазакі развезлі нас па розных частках горада. Яны ўсе былі ў балаклавах, натуральна, якія нас развозілі. Яны пыталіся: ‘Ці зручна вам сядзець, ці не цесна вам?’. Уключылі кандыцыянер у аўтазаку. Калі зачынялі дзверы пыталіся: ‘Ці нармальна, ці нічога не замінае, падпірае?’. Калі мы выходзілі з аўтазака, спускаліся па прыступках, фразы былі тыпу ‘ўсяго добрага!’, ‘да пабачэння!’.*

*Я іду, і з кожнай машыны грае песня ‘Пераменаў’. Я не разумею, што адбываецца, а потым, калі я дабраўся дадому, калі прыехалі сябры, і калі я выйшаў у Інтэрнет, убачыў тое, што ўвесь горад маршыруе. Вось толькі тады мы зразумелі, чаму яны ўсе такія ветлівыя былі ў апошні дзень”.*

# Збіццё, траўмы, пашкоджанні ў пацярпелых ад гвалту людзей

На працягу ўсіх дзён, 9 — 13 жніўня 2020 года, машыны хуткай медыцынскай дапамогі забіралі з ЦІП збітых і пакалечаных людзей у выключна рэдкіх выпадках, з дазволу сілавікоў. Нягледзячы на відавочныя траўмы, цяжкі стан затрыманых, у памяшканні ізалятара і на ўнутранай тэрыторыі медыцынская дапамога ім фактычна не надавалася ці надавалася ў рэдкіх выпадках.

Даволі складана зразумець, дзе менавіта людзі атрымалі траўмы, паколькі пад гвалт яны траплялі на ўсіх этапах — падчас затрымання, пры транспартацыі, падчас знаходжання ў РАУС Мінска і на тэрыторыі самога ЦІП. Нават калі пасля жорсткай “прыёмкі” некаторых пацярпелых размяркоўвалі адразу ў камеру і на працягу наступных да выхаду сутак ніякага гвалту да іх не было, то стан ад ужо атрыманых траўмаў ускладняўся жахлівымі ўмовамі ўтрымання — у перапоўненых у 5-6 разоў душных камерах і перапоўненых халодных прагулачных дворыках, з антысанітарыяй, катаваннямі дэпрывацыяй сну, адсутнасцю ежы і пітной вады.

> *“У мяне гады тры ці чатыры таму была траўма пляча. І ў мяне рэзка ў нейкі дзень забалела гэтае плячо. Я зрабіў МРТ — паказала разрыў сухажылляў і звязкі і падазрэнне на перелом храстковай костачкі. Зноў жа, быццам мяне там не білі, але я на ложку гэтым ляжаў, то бок ён там жалезны, вось гэтыя пруты, паміж якімі адлегласць даволі вялікая, і ляжаць на ім было нейк праблематычна”.*

З многіх апісаных вышэй сведчанняў бачна, што людзям, якія знаходзіліся на тэрыторыі ЦІП, не надавалася своечасовая і якасная медыцынская дапамога. Супрацоўнікі Акрэсціна надавалі мінімальную дапамогу толькі ў самых крытычных выпадках або ж не надавалі яе зусім. Таксама пацярпелыя распавядаюць пра тое, што сілавікі на Акрэсціна максімальна ўскладнялі працу лекарам хуткай медыцынскай дапамогі, якія прыязджалі на выклікі: не давзвалялі аглядаць усіх, каму была патрэбная дапамога, не дазвалялі забіраць пацярпелых з сур'ёзнымі траўмамі ў бальніцу. У нейкія моманты, нягледзячы на пратэсты лекараў, сілавікі самастойна праводзілі адбор людзей, якім дазвалялі надаць меддапамогу ці забраць у бальніцу:

> *“Перад тым, як мяне выпусціць з Акрэсціна, яны [супрацоўнікі Акрэсціна] сварыліся, што не могуць ідэнтыфікаваць, хто я такі. Яны доўга казалі медыкам, што не выпусцяць мяне, пакуль не даведаюцца маё прозвішча. Але медыкі казалі ім, што я безпрытомны, і гэта немагчыма”.*

Па сведчаннях пацярпелых, нават з лекарамі хуткай медыцынскай дапамогі сілавікі паводзілі сябе па-хамску, абражалі іх, пагражалі і перашкаджалі ў наданні дапамогі. Таксама былі выпадкі, калі машыны хуткай дапамогі доўга не выпускалі з тэрыторыі Акрэсціна.

Большасць траўмаў у пацярпелых была з-за перанесеных пабояў — выбітыя зубы і пашкоджанні сківіцы, гематомы, раны, удары, расцяжэнні, пераломы і ЧМТ (чэрапна-мазгавая траўма) рознай ступені цяжкасці. Гематомы маглі складаць да 80% усяго цела. Не менш цяжкія характэрныя дыягназы таго перыяду: унутраныя крывацёкі, пашкоджанні грудной клеткі, пераломы носа, рэбраў, ног, пальцаў рук, моцныя траўмы кісцяў рук з-за перацягнутых сцяжак, расцяжэнні звязак галёнкаступнёвых, локцевых і каленных суставаў. Таксама, калі людзей білі па галаве, удары часта прыходзілі на вушы. З-за гэтага частка пацярпелых сведчыць пра тое, што пазней ім ставілі дыягназ “перфарацыя барабаннай перапонкі”, таксама некаторыя адзначаюць пагаршэнне слыху:

> *“Вушы доўга праходзілі, таму што білі па вушах, то бок слых часткова страціў”.*

Некаторыя пацярпелыя кажуць пра тое, што ім ставіўся дыягназ “знясіленне”:

> *“Я быў моцна знясілены, збіты. Па мне было бачна, што я ледзь жывы”.*

Але ўсё ж асноўныя траўмы прыходзіліся на ніжнюю частку тулава:

*“У мяне вельмі моцнае пашкоджанне тазасцёгнавай косткі. Пасля гэтага я два з паловай тыдні ездзіў на інвалідным вазку, таму што я не мог хадзіць”.*

*“Калені, спіна, ягадзіцы, бёдры, а яшчэ ў мяне ў калене нейкая вадкасць сабралася”.*

Таксама шматлікія траўмы пацярпелымі былі атрыманыя падчас шматгадзінных стаянняў на каленях:

*“Мне потым паставілі посттраўматычны флебатрамбоз глыбокіх венаў. Гэта хутчэй за ўсё не толькі з-за збіцця, але і з-за таго, што нас знерухомілі і не давалі піць. Кроў згушчаецца ад недахопу вады. Плюс гэтая поза, у якой у цябе калені сагнутыя, таксама пагаршае сітуацыю”.*

Частка пацярпелых распавядае пра тое, што пасля вызвалення ў іх пачаліся праблемы з імунітэтам — прастуды, страчванне вагі, агульная невытлумачальная стомленасць:

*“Пакуль я знаходзілася ў ЦІП, відаць, арганізм максімальна сабраўся. Як толькі я выйшла адтуль, на другі дзень усё — маё здароўе пачало здаваць. Я і захварэла, у мяне тэмпература тры дні была 38-39. Пайшла да лекара. Кавід не знайшлі, але сказалі, што ў мяне імунітэт максімальна забіты. Потым тэмпература тыдзень была 35. У мяне была ўвогуле нямогласць: я нічога не хацела, не магла, я вось магла толькі хадзіць часам, у мяне была нейкая максімальная слабасць. За час знаходжання ў ЦІП я страціла восем кілаграмаў”.*

У ноч з 11 на 12 жніўня тэмпература паветра апускалася да +16˚С[13], такая ж яна заставалася і ўдзень. Ноч з 12 на 13 жніўня была яшчэ халаднейшая — да +15˚С, а ўначы з 13 на 14 жніўня тэмпература апусцілася да +13˚С. Тыя з затрыманых, якія знаходзіліся ў прагулачных дворыках ці ў дварах ЦІП, былі вымушаныя стаяць на вуліцы ў лёгкай летняй вопратцы без аніякай магчымасці сагрэцца. Таксама ў прагулачных дворыках людзей аблівалі вадой. Таму частка пацярпелых распавядае пра тое, што пасля вызвалення ад некалькіх дзён да двух тыдняў ім давялося лячыцца ад прастуды:

*“У мяне пасля ўсяго жахліва забалела горла і пару дзён была тэмпература 39. Я ўжо спалохаўся, што каранавірус, пайшоў здаў аналізы. Гэта, напэўна, наступствы бетоннай падлогі і праведзеных на ёй 26 гадзінаў уначы і халоднай вады з-пад крану, якую ўсе пілі з адной бутэлькі”.*

У многіх пачалося абвастрэнне хранічных захворванняў нырак (апушчэнні, павелічэнні), сэрца, спіны. *“У мяне раней балела паясніца, але цяпер гэта стала яшчэ горш, баліць лапатка, уздоўж пазваночніка шчэміць нерв”*. Многія адзначалі абвастрэнні хваробаў суставаў, а таксама іншых захворванняў:

*“У мяне праблемы са зрокам і гідрацэфалія — калі ў галаўным мозгу лішняя вадкасць. У мяне гэта набытае. І яна знаходзіцца ў спячым рэжыме. І яна не павінна развівацца, але пры моцным удары ў галаву магу зрок страціць. І ўдары прыляталі ў галаву. І балела як вокавы яблык. Дарэчы, зрок пагоршыўся пасля гэтых падзеяў”.*

Таксама варта адзначыць, што ў некаторых раённых паліклініках па Мінску лекары або адмаўляліся прымаць пацярпелых у перыяд пратэстаў або не надавалі ім належную дапамогу:

*“У пятніцу паехаў я ў сваю паліклініку. У паліклініцы ўсё апісаў, як усё пачалося, але мяне, чамусьці лекар не хацеў слухаць. Ён мне кажа — пашкоджанне, там трэшчына невялікая, нічога страшнага. Але ў мяне нага вельмі моцна баліць, я не магу зразумець, што з ёй. І потым паехаў я ў БХМД. Там прынялі, аглядзелі, зрабілі здымкі і выявілі, што ў мяне пералом шчыкалаткі і пералом фалангі*

13. https://www.timeanddate.com/weather/belarus/minsk/historic?month=8&year=2020

> *пальца".*

Былі выпадкі, калі ў дзяржаўных медыцынскіх установах лекары не мелі магчымасці надаваць належную дапамогу. Адзін апытаны распавядае, што пасля таго, як яго адпусцілі, у яго засталіся раны на нагах. Па медыцынскую дапамогу ён звярнуўся ў паліклініку па месцы жыхарства. Нейкі час ён хадзіў на перавязкі, але раны не праходзілі і пачыналі гнаіцца. Лекарка, якая працавала з ім, параіла звярнуцца ў прыватны цэнтр:

> *"Я, кажа, у паліклініцы, я не магу табе дастаць гэта [аскепкі], у мяне няма такіх [інструментаў], каб я табе дастала ці ўвогуле правярала. Едзь на МРТ".*

Пазней, у прыватнай медыцынскай установе, з нагі пацярпелага былі вынятыя металічныя аскепкі, паходжання якіх ён не ведае, і частка гумовай кулі.

Многія пацярпелыя распавядаюць пра псіхалагічныя парушэнні, такія як трывожнасць — *"першыя дні ў бальніцы было страшна, што зноў прыедуць, забяруць у міліцыю"*, парушэнні сну — *"і вока торгаецца, і сон ніякі"*, а таксама *"эмацыйная дысацыяцыя, панічныя атакі, ПТСР[14]"*, заціскі сківіцы — *"у мяне заклініла сківіцу, думаю, калі былі моманты страху, што цябе паб'юць, моцна заціскаеш, мне потым капу трэба было насіць, каб расслабіць"*. Многія казалі, што нейкі час пасля вызвалення баяліся выходзіць на вуліцу. Некаторыя не адчувалі сябе ў бяспецы нават дома. Частка пацярпелых апісвае стан дэзарыентацыі, часцей за ўсё ўва сне ці адразу пасля абуджэння, — ім здавалася, што яны ўсё яшчэ знаходзяцца на Акрэсціна:

> *"Я нават на вуліцу не выходзіў. То бок першыя два дні я выглядваў у вакно пастаянна, як параноік, прысутнічаў нейкі страх, што могуць прыехаць па мяне".*

> *"Першы час я мог прачнуцца пасярод ночы, таму што ад усведамлення гэтай стрэсавай сітуацыі нікуды не дзецца, нават калі ты там суперстрэсаўстойлівы. І я, калі прачынаўся пасярод ночы, я думаў, што я ўсё яшчэ там".*

У інтэрв'ю пацярпелыя апісвалі выпадкі сівізны, якая рэзка і моцна праступіла. Таксама быў апісаны выпадак заікання, якое пачалося:

> *"Я заікаўся амаль два месяцы пасля Акрэсціна. Я рэальна вельмі моцна заікаўся. Я ніколі ў жыцці не заікаўся".*

Многія пацярпелыя казалі, што пасля вызвалення пачалі вастрэй і агрэсіўней рэагаваць на розныя рэчы:

> *"Стаў нервовым, я сам заўважаў. На працы, да таго моманту я ўжо некалькі гадоў працаваў, таму вопыт у праекце ў мяне быў. Таму я патрабаваў ад тых, хто прыходзіць, каб праца выконвалася сумленна і якасна. Спачатку быў больш стрыманы, потым стаў больш рэзкі, часам грубы".*

Некаторыя гематомы, раны, удары, па словах пацярпелых, маглі праходзіць даволі хутка — ад некалькіх дзён да тыдня. Часцей за ўсё людзі практычна цалкам аднаўляліся праз два-тры тыдні. Але аднаўленне ад больш цяжкіх пашкоджанняў, якія патрабавалі стараннага лячэння, маглі займаць ад некалькіх месяцаў да года. Многія кажуць пра тое, што яны дагэтуль адчуваюць на сабе наступствы траўмаў, атрыманых у жніўні.

Што тычыцца псіхалагічнага стану, то нават у больш позніх апытаннях (восень 2022 года) частка пацярпелых адзначае, што цалкам аднавіцца ў іх так і не атрымалася — яны працягваюць сутыкацца з дэпрэсіяй, павышанай трывожнасцю і перыядычна маюць праблемы са сном.

## Увага! Наступныя чатыры старонкі ўтрымліваюць фота апісаных траўмаў.

14. Посттраўматычны стрэсавы разлад.

# Фота з кейсаў пацярпелых, якія былі апытаныя Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі

## 1 кейс





## 2 кейс



## 3 кейс



## 4 кейс



## 5 кейс



# Фота са справаздачы “Беларусь: скаардынаваная палітыка катаванняў. Судова-медыцынская экспертыза 50 выпадкаў катаванняў[15]





Тут і далей фота збітых мірных грамадзянаў пасля акцый пратэстаў у жніўні 2020 года ў г. Мінску.

15. https://www.legin.by/uploads/20211110_618b9ec2403b2.pdf
З-за боязі рэпрэсій не ўсе пацярпелыя далі згоду нават на публікацыю ананімных і абезасобленых фота слядоў катаванняў. Публікуем фота са справаздачы **“Беларусь: скаардынаваная палітыка катаванняў”** (аўтары: Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, Міжнародная рада па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў (IRCT) і яе Незалежная судова-экспертная група (IFEG)). Дадзеныя фота маюць тут ілюстратыўны характар. Мэта іх публікацыі — паказаць характар траўмаў затрыманых пасля масавых катаванняў у жніўні 2020 года.








# Асобы, адказныя за катаванні затрыманых у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў

*“Прыходзіць гэтая ‘лекарка’, кажа: ‘Гандон, што ты хочаш, бля?’ Ён папрасіў вады. ‘Лекарка’ была ў чырвонай сукенцы ў доўгай, дзесьці можа яна са святкавання нейкага ці яна так на працу ходзіць. Яна: ‘Жэня, дай яму піздзюлёў нахуй’. Прыйшоў нейкі Жэня і пачаў збіваць гэтага мужчыну. Адна жанчына-супрацоўніца, позірк я яе запомніў на ўсё жыццё, біла. Быў потым у камеры хлопец байкер, ён кажа, яна стала ў яго ў галаве нагамі і з дзвюх рук пачала біць яго паміж ягадзіц па машонцы”.*

Пацярпелыя, як правіла, сведчаць пра тое, што ў двары ЦІП і прагулачных дворыках, а таксама ў калідорах затрыманых збівалі ў асноўным сілавікі АМАПа ў чорнай форме і балаклавах, што істотна ўскладняе апазнанне дадзеных асобаў па фотаздымках.

Нягледзячы на тое, што многія супрацоўнікі ЦІП былі ў медыцынскіх масках, пацярпелымі былі апазнаныя некаторыя з тых, хто збіваў і здзекаваўся з затрыманых.

Разам з апазнанымі сілавікамі лічым неабходным пазначыць вышэйшых службовых асобаў, адказных за парушэнне законнасці ў ЦІП і беспакаранасць злачынцаў.

1. Асоба, якая займала пост прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, **Лукашэнка Аляксандр Рыгор'евіч**.
2. Былы міністр унутраных справаў Рэспублікі Беларусь **Караеў Юрый Хаджымуратавіч** (11 чэрвеня 2019 — 29 кастрычніка 2020).
3. Былы намеснік міністра ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь **Барсукоў Аляксандр Пятровіч** (2017 — 2020).
4. Былы начальнік Галоўнага ўпраўлення ўнутраных справаў Мінскага гарвыканкама **Кубракоў Іван Уладзіміравіч** (з 29 кастрычніка 2020 года міністр унутраных справаў Рэспублікі Беларусь).
5. Камандзір АМАП ГУУС Мінгарвыканкама **Балаба Дзмітрый Уладзіміравіч**.
6. Былы Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь **Конюк Аляксандр Уладзіміравіч** (2011 — 2020).
7. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь **Швед Андрэй Іванавіч**.
8. Пракурор горада Мінска **Лаўрухін Алег Уладзіміравіч.**
9. Пракурор Маскоўскага раёна г. Мінска **Шабан Віктар Яраслававіч.**

Пры апытаннях Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі пацярпелымі былі апазнаныя пазначаныя далей службовыя асобы, датычныя да катаванняў затрыманых у ЦІП ГУУС Мінгарвыканкама з 9 па 14 жніўня 2020 года. Ідэнтыфікацыя сілавікоў таксама праходзіла ў сацыяльных сетках, людзі апазналі іх пасля публікацыі фотаздымкаў у інтэрнеце. Пры гэтым грамадзяне зазначаюць, што сілавікі і пасля жніўня 2020 года працягваюць ажыццяўляць катаванні ў ЦІП.

| № | ПІБ | Апісанне |
|---|---|---|
| 1 | **Шапецька Яўген Андрэевіч**<br> | **Апазнаны многімі апытанымі**<br><br>Як начальнік ЦІП адказны за ўмовы ўтрымання і іншыя працэсы ў падведамнай яму ўстанове. Дапусціў масавыя катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі на тэрыторыі ўстановы. Непасрэдна аддаваў загады, не прымаў ніякіх дзеянняў для спынення катаванняў.<br><br>Па сённяшні дзень з'яўляецца начальнікам ЦІП і кіруе масавымі катаваннямі палітычных зняволеных. Мэтанакіравана стварае жорсткія і бесчалавечныя ўмовы ўтрымання для палітычных зняволеных.<br><br>*"Дакладна там быў і кіраваў працэсам".*<br><br>*"Начальніка бачыў 14-га жніўня, калі вызвалялі затрыманых з ЦІП".*<br><br>*"Бачыў начальніка ЦІП, маёра, ён быў без маскі. Сам нічога не рабіў".*<br><br>*"У двары часта вельмі прысутнічаў начальнік ЦІПа, не памятаю прозвішча, але морду я яго ведаю. Ён там пастаянна прысутнічаў пры гэтым збіцці, з яго можна будзе спытаць у рэшце рэшт".* |
| 2 | **Атрошчанка Юрый Міхайлавіч**<br> | **Апазнаны праз сацыяльныя сеткі**<br><br>Непасрэдна ва ўдзеле ў катаваннях не апазнаны, канваяваў затрыманых па камерах. Пры яго маўклівай згодзе здзяйсняліся катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі. Бачыў збітых і параненых, ніяк не рэагаваў на парушэнні законнасці.<br><br>*"Вось гэты таксама заводзіў-прыводзіў у камеры, але гэта не прадольны. Не ведаю, хто па званні. Абразаў не чула. Проста, як робат, быў"..* |
| 3 | **Цыбульскі Анатоль Анатолевіч**<br> | **Апазнаны апытанымі**<br><br>Пры яго маўклівай згодзе прымяняліся катаванні затрыманых. Бачыў збітых і параненых, ніяк не рэагаваў на парушэнні законнасці.<br><br>*"У другой палове дня 12 жніўня (было яшчэ светла) зайшлі ў прагулачную камеру разам з Урублеўскім. Былі без масак і ў цёмна-сіняй форме. Некалькі хвілінаў пастаялі ў камеры, аглядзелі яе і пра штосьці перамовіліся. У той момант камера была ў некалькі разоў перапоўненая, у ёй знаходзіліся цяжка збітыя людзі, стаяла вядро, якое выкарыстоўвалі як прыбіральню, паколькі ў прыбіральню нас не вадзілі. Прабыўшы ў камеры пару хвілінаў і ніяк не адрэагаваўшы на парушэнні, яны выйшлі".* |

| № | ПІБ | Апісанне |
|---|---|---|
| 4 | **Гасперчык Андрэй Міхайлавіч**<br> | **Апазнаны апытанымі і праз сацыяльныя сеткі**<br><br>Непасрэдна ў катаваннях не апазнаны. Пры яго маўклівай згодзе здзяйсняліся катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі. Бачыў збітых і параненых, ніяк не рэагаваў на парушэнні законнасці.<br><br>*“Падобны на супрацоўніка, які дзяжурыў на другім паверсе”.*<br><br>*“Самы адэкватны, наколькі гэта магчыма. Не абражаў, не прыніжаў. Крычаў на бяздомных і на тых, хто не па палітыцы”.*<br><br>*“Гасперчык Андрэй Міхайлавіч, дзяжурны, быў у званні капітан, называў нас ‘злодзеямі’. Вельмі рэдка, але можна было выпрасіць прагулку і папаліць (выводзіў позна ўвечары, каб начальства не бачыла), даваў цыгарэты. Сварыўся на бяздомных людзей, часам іх біў”.* |
| 5 | **Іваніцкі Дзмітрый Аляксандравіч**<br> | **Апазнаны праз сацыяльныя сеткі**<br><br>Непасрэдна ў катаваннях не апазнаны. Пры яго маўклівай згодзе здзяйсняліся катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі. Бачыў збітых і параненых, ніяк не рэагаваў на парушэнні законнасці.<br><br>*“Быў калідорным і прымаў-выпускаў людзей. Менавіта мяне выпускаў і праводзіў вобшук”.*<br><br>*“Гэта звычайны сяржант. Вадзіў на гутаркі, заводзіў у камеру і г.д. Прыніжэння і абразаў ад яго не заўважала”.* |
| 6 | **Шкурскі Канстанцін Віктаравіч**<br> | **Апазнаны апытанымі**<br><br>Непасрэдна ў катаваннях не апазнаны. Пры яго маўклівай згодзе здзяйсняліся катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі. Бачыў збітых і параненых, ніяк не рэагаваў на парушэнні законнасці.<br><br>*“Шкурскі Канстанцін Віктаравіч, яго твар знаёмы. 14 жніўня 2020 года мяне і яшчэ сотні людзей збіралі на асноўным двары паміж ІЧУ і ЦІП для адпраўкі ў іншыя месцы зняволення. Я яго тады там і бачыў. Запомніўся тым, што ён кіраваў гэтым працэсам і вельмі стараўся перад сваім начальствам, якое там таксама прысутнічала”.* |

| № | ПІБ | Апісанне |
|---|---|---|
| 7 | **Цішачкін Ігар Уладзіслававіч**<br> | **Апазнаны праз сацыяльныя сеткі**<br><br>Прымаў актыўны ўдзел у катаваннях і жорсткім абыходжанні з затрыманымі, сам праяўляў ініцыятыву, выслужваўся перад начальствам.<br><br>*“Вось ён не даў глуханямой жанчыне слыхавы апарат. Размаўляў матам, зьнішчаў усіх. Забіраў грошы з асабістых рэчаў у рахунак харчавання”.*<br><br>Пасля жніўня 2020 года<br><br>*“Абражаў, збіваў, забіраў матрацы ў тых, у каго яны былі, пагражаў выліць хлорку. Пераводзіў бяздомных, заражаных педыкулёзам (і/ці бялізнавымі вошамі) у перапоўненыя камеры з затрыманымі па палітычных артыкулах. Мне ён адмовіўся апускаць нару (апускаецца са знешняга боку), калі быў у карцары. Давялося спаць з тэмпературай на пліцты”.* |
| 8 | **Тукач/Каляда Святлана Віктараўна**<br> | **Апазнаная апытанымі**<br><br>Актыўна дапамагала прымяненню катаванняў, пагражала пацярпелым, не надавала медыцынскую дапамогу хворым і параненым затрыманым.<br><br>*“Яна там дакладна была. Як я памятаю, у якасці кіраўніцы медаддзела ІЧУ ці ЦІП. Яна падыходзіла і пагражала чалавеку, якога білі побач са мной”.*<br><br>*“Жанчына дакладна была пры прыёме, дапамагала пры дагядзе. Пагражала, была з дубінкай. Біла кагосьці ці не, не ведаю”.* |

| № | ПІБ | Апісанне |
|---|---|---|
| 9 | **Урублеўскі Яўген Аляксеевіч**<br> | **Апазнаны апытанымі і праз сацыяльныя сеткі**<br><br>Адзін з самых жорсткіх супрацоўнікаў ЦІП. Многія апытаныя сведчаць пра мэтанакіраванае збіццё ім затрыманых, характарызуюць яго як садыста, які збівае дзеля задавальнення. Вельмі стараўся выслужыцца перад начальствам і іншымі сілавікамі.<br><br>Па сённяшні дзень, не хаваючы, актыўна катуе палітычных зняволеных, ганарыцца сваімі дзеяннямі.<br><br>*“Мы стаялі на каленях, рукі за галаву, а гэты Жэня пастаянна нас біў”.*<br><br>*“...супрацоўнікі казалі: ‘Жэня, не лютуй, хулі ты так робіш увогуле’. Мянты акрэсцінскія паводзілі сябе адэкватна, калі зваліў амап. Яны разумелі, што мы людзі і нічога з намі не рабілі. Але пакуль быў амап, гэта быў п*** (жах). Жэня асабіста біў людзей, мяне збіваў нагамі і дубінкай, казаў: ‘Як табе кактэйлі молатава кідаць?’. Гэта быў дакладна ён”.*<br><br>*“Кашмарыў усіх. ... дакладна памятаю, што ён там быў і мы абмяркоўвалі паміж сабой: ‘Толькі б на гэтага бравістага не нарваца’”.*<br><br>*“... ён прымушае мяне распранацца, тыпу просіць, каб распранулі да трусоў, і па голым целе пачынае мяне збіваць”.*<br><br>*“Прыніжаў, крычаў, запалохваў. Адзначаўся асаблівай стараннасцю, а таксама ён выклікаў нейкіх людзей у чорным, якія мяне вывелі з камеры і збілі каля дзвярэй у калідоры, пасля чаго прымусілі выціраць кроў з падлогі сваёй жа майкай. Пасля таго як мяне збілі, Урублеўскі адчыніў камеру і выліў вядро вады на мяне і тых, хто сядзеў побач, са словамі, што ў наступны раз гэта будзе два вядры парашы. Калі адпускалі з ЦІП 14-га жніўня, ён асабіста адвёў мяне ў прагулачны дворык і трымаў там, пакуль усе не выйшлі, пагражаючы, што мяне звязуць у СІЗА за тое, што я адмовіўся падпісваць раскаянне, што больш так не буду і абяцаю нідзе не ўдзельнічаць”.*<br><br>*“Моцна крычаў, быў агрэсіўны. Не адчыніў нам вакно-кармушку, калі дзяўчаты казалі, што не хапае паветра. Называў нас сукамі”.*<br><br>*“Паводзіў сябе вельмі агрэсіўна. Гэты Яўген суправаджаў нас з камеры, крычаў на ўсіх матам і біў дубінкай, калі хтосьці не стаяў, упёршыся ў сцяну, спрабуючы павярнуць галаву”.*<br><br>*“Быў на 2-м і 3-м паверхах. Прыніжаў, абражаў, біў людзей. Было чуваць з камеры. Яму гэта ўсё прыносіла вялізнае задавальненне. Таксама ненавідзеў жанчын, называў бессэнсоўнымі насякомымі”.*<br><br>Пасля жніўня 2020 года<br><br>*“Ён прымушаў менавіта ўстаць уначы на ногі [катаванні дэпрывацыяй сну]. Ён вельмі груба ставіўся да ўсіх, вельмі груба. Яго раздражняла, што мы смяемся часам. А мы ж хацелі хоць неяк, каб не звар'яцець ад усяго гэтага — гулялі неяк, адцягваліся. Яго раздражняла тое, што мы смяяліся, ён тады пачынаў гучна калаціць у дзверы”.*<br><br>*“І сказаў, што раз вы такія пытанні задаяце [патрабаванне матрацаў і спальных месцаў], вас наведаў містар пропер [выліваюць хлорную вадкасць з вядра на падлогу камеры]. Кажа: ‘Вам бясплатную параду даю, прыбірайце як можна хутчэй, потым да ночы ахранееце!’ Наколькі я ведаю, гэта быў супрацоўнік дастаткова вядомы Урублеўскі Яўген”.* |

<table>
<tr><th>№</th><th>ПІБ</th><th>Апісанне</th></tr>
<tr><td>10</td><td>Гутарава/Лях Яўгенія Міхайлаўна<br></td><td>Апазнаная апытанымі і праз сацыяльныя сеткі<br><br>Непасрэдна датычная да фактаў жорсткага абыходжання з затрыманымі. Асабіста збівала, абражала і пагражала затрыманым. Адмаўляла ў просьбах пра медыцынскую дапамогу.<br><br>Па сённяшні дзень катуе палітычных зняволеных.<br><br>“Не рэагавала на просьбы пра ваду. Зверху з 2-га паверха, як жывёлам, скінулі нам на 123 чалавекі ў прагулачны дворык за 12 гадзінаў 3 разы толькі па 6 літраў вады. Яна і яшчэ адна супрацоўніца збівалі дзяўчат на 2 паверсе. У дзяўчат камера была на 4 чалавекі, у якой было больш за 40 чалавек. Збіццё было 10 жніўня”.<br><br>“Вельмі падобная на жанчыну, якая адмовіла мужчыну з дыябетам у наданні лекара або ж уколу інсуліну, сказаўшы яму: ‘Ты тут здохнеш’”.<br><br>“Наглядчыца, якая прымушала мяне пры затрыманні распрануцца і прысядаць (перад відэакамерай), вырвала з маіх красовак усцілкі, піхала мяне ў спіну. Потым ужо на другім паверсе перад камерай ударыла мяне каленам у жывот адзін раз. І паўтарыла гэта ў дзень майго суда 13 жніўня зранку”.<br><br>Пасля жніўня 2020 года<br><br>“Спрабавала выслужыцца перад начальствам. Калі была яе змена, нельга было нават ляжаць на падлозе. Калі штосьці рабілі не так, як ёй уздумаецца — званіла і скардзілася. Але пры гэтым любіла казаць, што яна ж нічога дрэннага не робіць і так шмат ‘дазваляе’”.<br><br>“Адна з самых мярзотных ‘прадольных’. Абражала, забірала з камеры ўвогуле ўсё, што ёй не спадабаецца (напрыклад, прыладу, з дапамогай якой можна было вакно зачыніць — адпаведна адзін раз засталіся з адчыненым вакном у халодны час сутак). Дзённыя агляды праводзіла з асаблівым задавальненнем, раскідвала рэчы/лекі, рвала, ламала рэчы і тапталася па іх. Была ў званні старшыні”.</td></tr>
<tr><td>11</td><td>Сакалоўскі Іван Юр’евіч<br></td><td>Апазнаны апытанымі<br><br>Непасрэдна ў катаваннях не апазнаны, аднак адмаўляў збітым і параненым людзям у шпіталізацыі. Пры яго маўклівай згодзе здзяйсняліся катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі. Бачыў збітых і параненых, ніяк не рэагаваў на парушэнні законнасці.<br><br>“Сакалоўскі, дастаткова поўны мужчына. З-за яго я не змог з’ехаць на хуткай з Акрэсціна. На тэрыторыю ЦІП заязджалі карэты хуткай, аглядалі затрыманых, самых цяжкіх забіралі. Мяне адвялі ў машыну хуткай, лекары правялі стандартныя працэдуры, каб высветліць мой стан. З намі ў машыну набралі яшчэ 3–4 затрыманых. Дакладна была дзяўчына, мы ўжо практычна збіраліся з’язджаць, але гэта не спадабалася Сакалоўскаму. Пачаў крычаць, практычна за каўнер выцягнуў усіх з машыны, са словамі ‘Усё, халява закончылася!’. Пасля крычаў яшчэ, што больш ніякіх хуткіх на тэрыторыі. Калі нічога не блытаю, сітуацыя была 12.08.20 г., недзе ў дыяпазоне 10:00–13:00. Бліжэй да абеду. Менавіта ён стаў прычынай таго, што я знаходзіўся на ЦІПе паўтара сутак са страсеннем мазгоў і перфарацыяй барабаннай перапонкі, узамен на тое, каб своечасова атрымаць медыцынскую дапамогу”.</td></tr>
</table>

| № | ПІБ | Апісанне |
|---|---|---|
| 12 | **Есмантовіч Сяргей Мікалаевіч**<br> | **Апазнаны праз сацыяльныя сеткі**<br><br>Па падзеях 9–14 жніўня 2020 года з дакладнасцю не апазнаны, аднак, па сведчаннях пацярпелых, ужывае катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі ў ЦІП дагэтуль.<br><br>*“Гэта, калі не памыляюся — маёр. Абражаў, прыніжаў. Крычаў матам, жанчын асабліва ненавідзеў палітычных”.*<br><br>*“Быў у званні маёра, адзін з дзяжурных. Збіў мужчыну за тое, што той ‘не так’ адказаў Гутаравай. Удар быў гумовай палкай па спіне. Агулам матам размаўляе, напаўняе камеры па 20 чалавек і падсаджвае [у камеры да палітычных] бяздомных”..* |
| 13 | **Кулагін Эдуард Генадзевіч**<br> | **Апазнаны праз сацыяльныя сеткі**<br><br>Па падзеях 9–14 жніўня 2020 года з дакладнасцю не апазнаны, аднак, па сведчаннях пацярпелых, ужывае катаванні і жорсткае абыходжанне з затрыманымі ў ЦІП дагэтуль.<br><br>*“У асноўным бачыў на вечаровых аглядах, з кіянкай (кіянкай прастукваліся ложкі). Адвешваў нясмешныя жарты пра тое, што канкрэтна ў нас, палітычных, няма правоў, і абражаў”.* |

З мэтай недапушчэння ўнікнення адказнасці асобаў, датычных да катаванняў у ЦІП на Акрэсціна, працэс іх апазнання працягваецца.

Калі вы ведаеце ці пазнаеце каго-небудзь з сілавікоў на апублікаваных фота[16], просім звязацца з Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі (сайт https://torturesbelarus2020.org/ru/, e-mail: contact@torturesbelarus2020.org , Telegram: @ICTB2020_contact ). Гарантуем максімальную бяспеку пры камунікацыі.

16. https://telegra.ph/Opoznanie-Sotrudniki-CIP-Okrestina-02-02

# Прававая кваліфікацыя дзеянняў супрацоўнікаў сілавых органаў Беларусі

Прыведзеныя вышэй шматразовыя сведчанні паказваюць, што ў дачыненні да затрыманых мірных грамадзянаў 9–14 жніўня 2020 года супрацоўнікамі Міністэрства ўнутраных справаў на тэрыторыі Цэнтра ізаляцыі правапарушальнікаў ГУУС Мінгарвыканкама ў г. Мінску былі здзейсненыя масавыя шырокамаштабныя акты гвалту, мучэнняў і жорсткасці, выражаныя ў наступным.

Схопленыя на вуліцах горада Мінска і дастаўленыя ў ЦІП грамадзяне трапілі пад арганізаванае збіццё шляхам іх праходаў праз строй супрацоўнікаў, узброеных дубінкамі (так званыя "калідоры"). Потым у двары ЦІП затрыманыя выстаўляліся ўздоўж сцяны і ў статычнай позе, на каленях з паднятымі ўверх рукамі, часам зусім голыя, пад пагрозай ці з выкарыстаннем гвалту ўтрымліваліся на працягу доўгіх гадзінаў, таксама адчуваючы страшэнныя пакуты і боль. За найменшае непаслушэнства, нясмелы пратэст і простае патрабаванне выканання правоў яны атрымлівалі збіццё, абразы, пагрозы згвалтаваннем і г.д.

У дачыненні да затрыманых жанчын выкарыстоўваўся фізічны гвалт, цынічныя абразы, пагрозы згвалтаваннем, у тым ліку ў вычварэнскай форме; дагляды жанчын мелі прыніжальны характар, а часам праводзіліся ў прысутнасці мужчын.

Асаблівай жорсткасцю вылучалася ўтрыманне сотняў людзей у так званых прагулачных дворыках. На працягу 12–15 гадзінаў, а часам і да двух сутак, людзі, у большасці сваёй збітыя, часта паўголыя, без ежы і вады, без наведвання прыбіральні, халоднымі начамі ўтрымліваліся ў бетонных скрынках пад адкрытым небам, з-за цясноты не маючы магчымасці ні сесці, ні легчы.

Такім жа было і ўтрыманне затрыманых у жахліва перапоўненых камерах, дзе яны вымушаныя былі спаць на падлозе, сталах, тумбачках, ля прыбіральні. Належныя па законе матрацы, пасцельныя прылады, туалетная папера, прадметы жаночай гігіены не выдаваліся. З-за спякоты і высокай вільготнасці затрыманыя нярэдка гублялі прытомнасць. У камерах панавалі антысанітарыя, смурод, прусакі. Суткамі затрыманым не выдавалі ежу, любыя патрабаванні пра выкананне іх правоў прыгняталіся або сілай, або ў камеру залівалася вада ці водны раствор хлору, што рабіла ўмовы яшчэ больш невыноснымі. Медыцынская дапамога часта не надавалася, лекі не выдаваліся.

Большасць апытаных грамадзянаў таксама адзначалі, што або бачылі самі, або чулі з камераў ці прагулачных дворыкаў, як па начах у двары ЦІП ажыццяўлялася масавае збіццё грамадзянаў, дастаўленых з вуліцаў горада.

Пры такіх абставінах адлюстраваныя ў гэтым дакладзе дзеянні сілавікоў АМАП і ЦІП ГУУС Мінгарвыканкама ў дачыненні да затрыманых людзей з'яўляюцца злачыннымі як па ўнутраным, так і па міжнародным праве.

Гэтыя дзеянні цалкам ахопліваюцца складам злачынства, прадугледжанага арт. 128 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (злачынствы супраць бяспекі чалавецтва), згодна з якім незаконнае ўтрыманне ў зняволенні, катаванні ці акты жорсткасці, якія здзяйсняюцца ў сувязі з палітычнымі перакананнямі грамадзянскага насельніцтва, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дваццаці пяці гадоў ці пажыццёвым пазбаўленнем волі, ці смяротным пакараннем.

З пункту гледжання міжнароднага крымінальнага права пераказаныя акты гвалту кваліфікуюцца згодна з падпунктамі e), f) і k) пункта 1 артыкула 7 Рымскага статута Міжнароднага крымінальнага суда як злачынствы супраць чалавечнасці ў выглядзе зняволення ў турму ці іншае жорсткае пазбаўленне фізічнай свабоды ў парушэнне асноватворных нормаў міжнароднага права, а таксама ў выглядзе катаванняў і іншых бесчалавечных дзеянняў аналагічнага характару, якія заключаюцца ў наўмысным прычыненні моцных пакутаў ці сур'ёзных пакалечанняў ці сур'ёзнай шкоды псіхічнаму ці фізічнаму здароўю.

З'яўляецца вельмі важным і тое, што з улікам таго, што злачынства, прадугледжанае арт.128 КК, належыць да найбольш небяспечных злачынстваў супраць міру і бяспекі чалавецтва, арт. 85 КК вызначае, што асобы, вінаватыя ў здзяйсненні гэтага злачынства, вызваленню ад крымінальнай адказнасці ці пакарання ў сувязі з заканчэннем тэрмінаў даўнасці не належаць.

Аднак рэалізацыя крымінальнай адказнасці вінаватых асобаў у межах існага ў Беларусі палітычнага рэжыму ў цяперашні час практычна немагчымая, бо малаверагодна, што яна будзе ажыццёўлена тымі ж асобамі, якія і з'яўляюцца вінаватымі ў здзяйсненні гэтых злачынстваў.

Практычна неажыццяўляльнае і аддане вінаватых Міжнароднаму крымінальнаму суду — Рэспубліка Беларусь не з'яўляецца ўдзельніцай Рымскага Статута.

Найбольш перспектыўным у гэтым сэнсе з практычнага пункта гледжання з'яўляецца выкарыстанне механізма ўніверсальнай юрысдыкцыі.

Па наяўнай інфармацыі, адзін крымінальны працэс у парадку ўніверсальнай юрысдыкцыі па падзеях у Беларусі ў 2020 годзе пачаты ў Літве[17].

17. https://www.prokuraturos.lt/lt/pre-trial-investigation-launched-into-possible-torture-of-a-person-in-a-foreign-state/7240